Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдактар—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапатрабаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзкія — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шкапарай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шкапарай наперад тэксту 1 р. — к. За радок шкапарай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. нашчэнку.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 275 (2463) Пятніца, 30-га лістапада 1928 г.

Аб кантрактацыі засеваў.

«Правда» ў перадавіцы піша:

Кантрактацыя яравых і азімых засеваў збожжавых культур выклікала вялікі рост вытворчых аб'яднаньняў сялянскіх гаспадарак. Кантрактацыя дапамагае пашырэньню абшараў засеваў у закантрактаваных гаспадарках, масаваму ўкараненьню чыстагатункавага насеньня, увядзеньню паляпшаных мэтадаў апрацоўкі зямлі і засеву-зяблевага ўзорваньня, радавога засеву, ачысткі і пратручваньня насеньня і шмат якіх іншых агрэкультурных паляпшаньняў. Кантрактацыя робіцца магутным сродкам клясавае барацьбы на вёсцы, адною з асноўных форм вытворчае дапамогі беднаце, выцісканьню кулацкае арэнды, кулацкага крэдыту і машынапракату.

На 1929 год урад пакінуў па СССР шырокі плян кантрактацыі засеваў тэхнічных і харчовых культур, а таксама прадуктаў жывёлагадоўлі. У гэтым годзе кантрактацыяй будуць цалкам ахоплены засевы бавоўны, буракоў і большая частка засеваў іншых сыравінных культур. Упяршыню будзе разгорнута ў шырокім абхвате кантрактацыя прадуктаў жывёлагадоўлі і моцна пашыран, у параўнаньні з папярэднім годам, плян кантрактацыі засеваў збожжавых культур, намечаны на вялізным абшары ў 15 мілёнаў гектараў. Разам з закантрактаванымі ў азімую кампанію засевамі прадукцыя кантрактацыі забясьпечыць у новую хлебную кампанію плянавую здачу дзяржаве больш аднае трэці ўсяго намечанага для плянавых загатовак хлеба. У тым ліку кантрактацыя чыстагатункових засеваў павінна даць каля 16 мілёнаў центнэраў, ці 100 міл. пудоў чыстагатункова збожжа.

Устаноўлены ўрадам плян кантрактацыі павінен быць цалкам выканан. Галоўнаю ўмовай пасьпешнага выкананьня пляну кантрактацыі выступае яго своячасное правядзеньне. Кантрактацыя павінна быць увязана непасрэдна з пашырэньнем засеўных абшараў і ўвядзеньнем у сялянскія гаспадаркі агрыкультурных паляпшаньняў, апрача таго, кантрактацыя павінна быць такім-жа парадкам увязана з плянамі машынадастаўкі, вучотам кантрактуемых гаспадарак, заказамі на машыны і інш., і плянавым вытворчым крэдытаваньнем сялянскіх гаспадарак. Адною з галоўных задач надыходзячае засеўнае кампаніі выступае магчымка больш шырокі пераход ад гадавое кантрактацыі да доўгагадовае.

Вытворчае каапераваньне ахопленых кантрактацыяй сялянскіх гаспадарак, выкарыстоўваньне для гэтае мэты трактарных калён, каапэрацыі і савецкіх гаспадарак, павінна быць пастаўлена ў центры ўвагі пры правядзеньні кампаніі. Кантрактацыяй трэба ахапіць усе існуючыя калектыўныя гаспадаркі і зрабіць яе базай для шырокага разгортваньня будаўніцтва новых калектыўных гаспадарак. Каапэрацыя павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на абслугоўваньне прыцягнутых да кантрактацыі бядняцкіх і незаможных сялянскіх гаспадарак, захоўваючы ў гэтай галіне клясавую лінію. Нагул, кантрактацыя павінна быць непасрэдна зьвязана з арганізацыяй вытворчае дапамогі беднаце. Трэба разгарнуць шырокую ініцыятыву і самадзейнасьць бядняцка-серадняцкіх мас навакол кантрактацыі, узьняць актыўнасьць і сельска-гаспадарчае каапэрацыі.

Кантрактацыя павінна быць праведзена ў гэтым годзе, як самая важная масавая грамадзкая кампанія на вёсцы.

ПРАМОВА тав. МОЛАТАВА НА ПЛЕНУМЕ МК УсеКП(б).

БАРАЦЬБА З ПРАВАЮ НЕБЯСЬПЕКАЮ НЯ ЁСЬЦЬ ПЫТАНЬНЕ ТОЛЬКІ СЯГОНЬНЕШНЯГА ДНЮ.

Дамагчыся, каб яшчэ больш актыўна, яшчэ больш шырока ЎСЯ партыйная маса ўдзельнічала ВА ЎСІМ жыцьці партарганізацыі.

Таварышы Гэты пленум маскоўскага камітэту праходзіць якраз пасьля пленуму Цэнтральнага Камітэту партыі, які толькі што скончыўся. Вынікі працы пленуму ЦК мы будзем абгаварваць у бліжэйшыя дні асобна на актыве. Зараз-жа, пад канец працы гэтага пленуму МК мае прыдзецца зрабіць толькі некалькі заўваг аб задачах, якія зараз стаяць перад Маскоўскім Камітэтам, асабліва ў зьвязку з вядомымі падзеямі, якія мелі месца ў апошні час у маскоўскай арганізацыі. Гэтыя падзеі ўскладнялі маскоўскую арганізацыю і не маглі не ўскладняць. І пякер, перад пераходам да далейшай працы пасьля раду праведзеных мер, патрэба якіх вынікла з становішча, якое стварылася ў Маскоўскай арганізацыі, нам трэба забясьпечыць дружную працу арганізацыі ў цэлым, як і кожнага яе органу, кожнае яе ячэйкі, на аснове тае лініі і тых пастаноў, якія даны партыяй.

Маскоўскія рабочыя і работніцы мелі за мінулыя гады шмат буйных посьпехаў. Гэтыя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва растуць з кожным днём. У рабочай клясе Савецкага Саюзу маскоўскі пралетарыят займае адно з першых месц. У радох нашае вялікае партыі маскоўская арганізацыя займала і займае таксама адно з першых месц. Пры гэтым маскоўская арганізацыя выявіла вялічэзны ідэёва-палітычны рост. Гэтыя посьпехі маскоўскага пралетарыяту і рост сіл самае партыйнае арганізацыі ёсьць вынікі вельмі напружанае працы арганізацыі на аснове агульнапартыйнай лініі. Трэба пры гэтым памятаць аб тым, што посьпехі нашае працы і самы рост партыйных мас у арганізацыі, высоўваюць перад намі новыя павышаныя патрабаваньні.

Больш, чым калі-б та ні было раней, у сучасных умовах, калі перад намі паўсталі яшчэ больш буйныя і да таго-ж яшчэ больш пяклістыя задачы, нам патрэбна выразнасьць палітычнае лініі, цьвёрдасьць правядзеньня гэтае лініі і згуртаванасьць партыйных радоў. Мы ведаем, што базаю для нашае работы выступаюць пастановы партыі. У сучасны момант базаю для ўсяе нашае палітычнае і практычнае работы на бліжэйшы перыяд выступаюць пастановы, якія ўхвалілі пленум Цэнтральнага Камітэту партыі. Гэтыя пастановы павінны быць пакладзены ў аснову ўсяе нашае працы. У гэтых пастановах намечаны новыя задачы перад усёй рабочай клясай, перад усёй нашай партыяй. У гэтых пастановах зазначаецца на вялікія цяжкасьці, якія стаяць перад намі і рабочай клясай. У гэтых пастановах гаворыцца аб тым, што сучасны перыяд сацыялістычнае індустрыялізацыі і рэканструкцыі ўсяе гаспадаркі на аснове вышэйшае тэхніці патрабуе выключнага ўзьнімцця актыўнасьці шырокіх партыйных мас, а таксама разгортваньня вялікае працы масавых арганізацый рабочае клясы—прафэсыянальных, савецкіх, каапэрацыйных і др. Гэта выключна буйныя, значныя і пяклістыя задачы, якія азначаюць пераход да непасрэднага сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы і якія маюць вялікае значэньне ня толькі з пункту погляду Савецкага Саюзу, але і з пункту погляду інтэрэсаў міжнароднае пралетарскае рэвалюцыі.

Пленум Цэнтральнага Камітэту партыі прайшоў пад знакам разгортваньня гэтых новых задач і ўстаноўленьня практычных шляхоў і іх ажыцьцяўленьня. Разам з тым пленум паказаў, што з пункту погляду ўнутрыпартыйнага развіцьця на першае месца ставіцца барацьба супроць правае небясьпекі, супроць прыміранчых адносін да гэтае правае небясьпекі і да ўсіх ухілаў ад ленінскай лініі партыі.

Пленум Цэнтральнага Камітэту адпаведна прызнаў, што задача барацьбы з правай небясьпекай і прыміраньцтвам да яе выступаецца ў сучасны момант цэнтральнаю задачаю, якую трэба ўвязаць з узмоцненаю барацьбою ў адносінах да троцкісцкіх элементаў, якія дзе-ні-дзе ажыцьцяўляюць на-за партыяй, а таксама троцкісцкіх настроеў унутры партыі.

Пытаньне барацьбы супроць правае небясьпекі, г. зн. супроць адкрытага апартунізму не зьяўляецца пытаньнем толькі сёньняшняга дня. На бліжэйшы час, на бліжэйшы перыяд гэтая задача набывае асаблівае значэньне. Гэтая задача патрабуе ад партыі запяжное барацьбы і сыстэматычнае работы па зьвяртаньні тых хістаньняў, якія ў нас выявіліся за апошні час у вострай форме. Абвостраныя ў апошні час гаспадарчыя цяжкасьці зьявіліся ня толькі з канюнктурай дзнага моманту. Яны маюць сувязь, і пры тым вельмі глыбокую сувязь, з усім перыядам, які называецца перыядам сацыялістычнае рэканструкцыі нашае гаспадаркі. З гэтага вынікае, што пяклістьці нашага ўнутранага развіцьця ня могуць не знаходзіць у залежным, асабліва ў момант іх абвастраньня, свайго адбітку ў узманеньні хістаньняў і ўнутры нашых партыйных радоў.

Мы ведаем, што ў маскоўскай арганізацыі гэтыя хістаньні знайшлі сваё адлюстраваньне.

Гэта было сказана ў адозьве Цэнтральнага Камітэту да маскоўскае арганізацыі ме сяц таму назад. Пленум ЦК адназгодна ўхваліў гэтую адозву Цэнтральнага Камітэту, прызнаўшы ўсё зазначанае ў гэтай адозве абсалютна правільным і своячасна даканым Цэнтральным Камітэтам.

Вось-жа для ўсяе партыі, у тым ліку і для маскоўскае арганізацыі, базаю для працы зьяўляюцца пастановы партыі і, між іншым, пастановы апошняга пленуму ЦК. Гэта значыць, што нашая ўвага павінна быць завострана супроць правага ўхілу, супроць прыміранчых адносін да яго. Мы павінны помніць разам з тым аб тых асаблівасьцях барацьбы з правым ухілам, якія ўласьцівы данай стадыі гэтае барацьбы. Нашая тактыка і практычная крокі і тут выплываюць як з аднэй агульных перспектыў развіцьця мапалітнае ленінскае партыі, так і з вучоту асаблівасьцяў у становішчы партыі і, між іншым, у становішчы яе барацьбы супроць правага ўхілу ў даны момант.

Яшчэ два словы аб становішчы ў маскоўскай арганізацыі. Нам прыдзецца лічыцца з тым фактам, што ў апошні час—што грэх таіць—ня было з боку маскоўскага камітэту выстарчальнага кіраўніцтва ў адносінах арганізацыі. Ня было выстарчальнае выразнасьці ў лініі, ды і моцна пацярпела практычная праца. Для гэтага, як вядома, прычыны былі. Арганізацыя значна ўзьнялася ў сваёй масавай актыўнасьці, і гэта—вялізны плюс.

Аднак, ёсьць і элементы расхістанасьці і няўгодненасьці ў практычнай працы. І зараз нам трэба падагнацца, дабіцца большага адзінства ва ўсёй працы ня толькі ў палітычнай лініі, але і ў сваім практычным ажыцьцяўленьні гэтае лініі.

Асобна скажу аб тых таварышах, якія дазволілі сабе ў апошні час некаторыя памылкі, а імянна, прыміраньчыя настроі ў адносінах правага ўхілу. Нашым абавязкам зьяўляецца—зрабіць усё магчымае, каб палегчыць ім магчымасьць працавать у арганізацыі, удзельнічаць побач з усімі членамі партыі ў справе ажыцьцяўленьня пастаноў партыі. Пад гэтым кутом погляду сёньня бюро МК абгаварвала заяву Міхайлава аб вызваленьні яго ад абавязкаў старшыні МГСПС з прычыны таго, што дзе-ні-дзе ў райёнах пачалі ўхваляць адпаведныя пастановы. Бюро МК адназгодна адхіліла гэтую просьбу. Бюро МК выходзіла тут з таго, што гэтая пастанова будзе свайго роду практычнай дырэктывай для працы ў райёнах, паветах, на ўсёй арганізацыі. Нам няма патрэбы ізноў і ізноў выцягваць зробленыя ў мінулым памылкі. Нам няма патрэбы варушыць гэтыя памылкі. Зразумела, што тое, што зроблена, ня вынікае бясьсьледна. Зарубка застанецца. Аднак, нам трэба ўсё зрабіць для таго, каб таварышом, якія хочуць і могуць направіцца, каб таварышом, якія імкнуцца ўвайсьці ў агульную калёіну працы, усіляк дапамагчы гэта зрабіць.

На аснове ўхваленых партыяй пастаноў мы пойдзем наперад. Палітычная лінія маскоўскае арганізацыі была і застанецца лінія партыі. Гэта значыць, што ў даны перыяд мы, змагаючыся з усімі ўхіламі ад генэральнае лініі, з асаблівай сілаю ўдарым па правай небясьпецы і прыміраньчых адносінах да яе. Разам з тым, мы будзем дамагацца, каб яшчэ больш актыўна, яшчэ больш шырока ўся партыйная маса ўдзельнічала ва ўсім жыцьці арганізацыі, а гэта будзе азначаць далейшы рост арганізацыі і, разам з тым, зьявіцца асноўнаю ўмовай у вырашэньні найважнейшых практычных задач, якія стаяць перад намі. Пры гэтым самаю першаю задачаю кіраўнікоў арганізацыі зьяўляецца сапраўднае забясьпечэньне бальшавіцкага кіраўніцтва ўсёю працаю маскоўскае арганізацыі (воплескі).

У Саюзных Рэспубліках.

Пад знакам цеснага згуртаваньня вакол партыі

АДЧЫНІЛАСЯ ЎСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА РАБСЕЛЬКОРАЎ.

МАСКВА, 27-XI. 28-га лістапада пачалася ўсесаюзная нарада рабселькораў. Прыехала на нараду звыш 600 удзельнікаў. Пасьлядоўнае адчыненьне т. Ульянава, якая адзначае ў сваёй прамове, што на гэтай нарадзе ўпяршыню прысутнічаюць прадстаўнікі ўсіх галін рабселькораўскага руху. Таксама ўпяршыню прысутнічаюць рабкоры капіталістычных краёў—Нямеччыны, Францыі, Нарвэгіі, Чэхаславакіі. Міжнародная рабкораўская сувязь ужо заснавана і зараз набывае асаблівае вялікае значэньне, з прычыны ўзмоцненае ваеннае небясьпекі. Сувязь савецкіх рабселькораў з чужаземнымі рабкорамі дасьць магчымасьць лепш змагацца з паклёпам, які распаўсюджваецца заграніцаю аб СССР.

Наш край,—гаворыць далей Ульянава,—зараз шчыльна падышоў да задачы сацыялістычнае перабудовы. Рабселькоры павінны быць застрэльшчыкамі ў справе выкананьня гэтае самае важнае і цяжкае задачы. Разам з тым, рабселькоры павінны быць застрэльшчыкамі ў барацьбе, якую мы вядзём проці нашага клясавага ворага, вельмі часта—ўтоенага ворага ўнутры нашага краю, які пераблытвае палітыку савецкае ўлады і лінію кампартыі і актыўна змагаецца проці савецкае ўлады і проці партыі. Нам трэба распрацаваць шэраг мерапрыёмстваў, каб абарнуць рабселькораўскі рух у масавы рух. Большага напружаньня ўсіх нашых сіл і энэргіі вымагаюць у нас усе тыя цяжкасьці, якія стаяць перад намі ў зьвязку з задачай рэканструкцыі гаспадаркі нашага краю.

У прэзыдыум абіраюцца т. т. Бухарын, Ульянава, Мар'я Ільінічна, Галовіч, Яраслаўскі, Крыніцкі, Інгулаў, Фэлікс Кон, Якубаў, Дзям ян Бедны, Кастроў, Ілізарава А. І., прадстаўнікі чужаземных рабселькораўскіх рэдакцый і інш. Ганарозымі членамі прэзыдыуму абраны ўвесь склад Палітбюро, т. т. Арджанікідзе, Клара Цэткін, Крупская, Максім Горкі.

З дакладам аб бягучым моманце і задачах друку выступіў спатканы гучнымі воплескамі т. Бухарын.

Пасьля дакладу Бухарына нарада заслухала шмат прывітаньняў. Ад выканкому Камінтэрну нараду вітаў т. Бэла

— Выканком Камінтэрну,—сказаў ён,—лічыць патрэбным, каб тут на вашай нарадзе была заснавана шчыльная сувязь з рабкорамі рэвалюцыйных газэт заходніх краёў. Таму выканком Камінтэрну ўскладае вялікія надзеі на нараду вашай канфэрэнцыі.

У канцы т. Бэла перадаў братэрскае баявое камуністычнае прывітаньне рабселькорам Савецкага Саюзу. Потым былі заслуханы прывітаньні ад чужаземных рабкораў. З адказам на прывітаньне чужаземных рабкораў выступіў ленінградзкі рабкор, які ад імя нарады перадаў чужаземным таварышам пралетарскае прывітаньне і пачуцьцё захапленьня ад іх гэраічнае барацьбы. Нарада пастанавіла паслаць прывітаньне ЦК УсеКП(б), выканкому Камінтэрну, ЦВК СССР, Чырвонай армії, рэдакцыі „Правды" і рэдакцыі часопісі „Рабоче-Крестьянский Корреспондент", які 28 лістапада сьвяткаваў 5-гадовы юбілей свайго існаваньня. Нарада вылучыла таксама 3 дэлегатаў для прывітаньня сэсіі ўсерасейскага ЦВК.

Новы нажым пілсудчыны на сойм.

НЕАБМЕЖАВАНЫЯ САКРЭТНЫЯ ФОНДЫ ДЛЯ АХРАНКІ БЯЗ САНКЦЫЙ СОЙМУ.

Выклік сойму з вуснаў міністра Складкоўскага.

ВАРШАВА, 27-XI. У часе абмеркаваньня бюджэту міністэрства ўнутраных спраў у бюджэтнай камісіі сойму, міністр унутраных спраў Складкоўскі паведаміў, што, наперакор адмоўнай пастанове сойму аб дачы міністэрству сакрэтных фондаў у леташнім годзе, урад асыгнаваў яму сродкі на сакрэтныя выдаткі столькі, колькі міністэрства пажадае. Неадкладна пасьля яго заявы прадстаўнікі 3-х клюбў лявіцы, якія аб'ядналіся ў саюзе «абароны парляманцтарызму і дэмакратыі» супольна з эндэкамі падалі ў камісію сойму пратэст проці антыпарляманцкіх учынкаў ураду.

Прамова Складкоўскага наогул была зроблена ў вельмі агрэсыўных тонах. Між іншым Складкоўскі зазначыў, што нельга дазваляць сабе крытыкаваць Пілсудзкага.

Канфіскавана грашовая дапамога лодзінцам ад рабочых СССР.

ВАРШАВА, 27-XI. Пры арышце сяброў стачачнага камітэту Відзеўскае мануфактуры ў Лодзі канфіскаваны значныя сумы, якія прызначаліся для раздачы бастуючым.

Вячэрнія газэты паведамляюць, што на Відзеўскай мануфактуры выбухнуў пажар, які зьнішчыў некалькі будынкаў фабрыкі.

Беларуская гімназія ў Радашковічах зачынена ўладаю.

ВАРШАВА, 28-XI. Камісія сойму адхіліла прапанову беларускіх дэпутатаў адчыніць беларускую гімназію ў Радашковічах, зачынёную за тое, што яе вучні, нібыта, займаліся камуністычнаю дзейнасьцю.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

ПРАЦЭС 21-го Ў НАВАГРАДКУ.

ВАРШАВА, 28-XI. Учора ў Наваградку распачаўся працэс 21 асобы, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці.

Прысуд над б. паслом сойму.

Віленскі акруговы суд прыгаварыў б. пасла сойму Гэльмана на 1 мес. вастрогу за тое, што ён быццам абразіў на віленскім вакзале паліцыянта Абалунаса. Па амністыі Гэльман, аднак, звольнен ад кары.

12 гадоў катаргі.

Віленскі акруговы суд разьбіраў 26 лістапада справу нейкага Я. Розэнберга, які быццам зьяўляўся сэкратаром КПЗБ у Вільні. Суд прыгаварыў Я. Розэнберга за ўдзел у памянёнай арганізацыі на 12 гадоў катаргі.

Зьезд старастаў Віленшчыны.

6 і 7 сьнежня ў Вільні адбудзецца зьезд старастаў Віленскага ваяводзтва. На нараду дню знаходзяцца гаспадарчыя, земельныя і адміністрацыйныя справы.

Рэвізія ў віл. літоўскіх друкарнях.

Нядаўна віленская паліцыя зрабіла ўначы рэвізію ва ўсіх віленскіх літоўскіх друкарнях. Паліцыя шукала літоўскіх мап, па якіх дзяржаўныя межы Літвы не супадаюць з сучаснай дэмаркацыйнай лініяй між Літвой і Польшчай.

Зьмены ў віл. літоўскім друку.

З 1 сьнежня ў Вільні спыняць выхад 3 літоўскія выданьні: „Вільніаус Айдас", «Келяс» і «Дзірва». Замест іх будзе выходзіць тыднёвік пад назвай «Вільніаус Рытаюс», які сваёй ідэалёгіяй будзе зблізканы да ўрадавай у Літве партыі «Таўцінікаў».

Апазіцыйныя да сучаснага літоўскага ўраду элементы будуць выдаваць свае газэты: «Вільніаус Варпас», «Вільніаус Сэвэа» і «Пірмін».

НА БАРАЦЬБУ З ПРАЯВАМІ ПАСЛАБЛЕНЬНЯ ПРАЦОЎНАЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ.

(З закл. слова т. Куйбышава на пленуме ВСНГ СССР).

МАСКВА. У спрэчках на дакладу Куйбышава на пленуме ВСНГ СССР аб задачах прамысловасьці у 1928-29 г. надзвычайна востра было высунута пытаньне наконт працоўнае дысцыпліны на прадпрыёмствах. Большасьць выступаўшых гаспадарцаў зазначала на паслабленьне дысцыпліны.

Сваё заключнае слова Куйбышаў таксама амаль цалкам прысьвяціў пытаньню аб працоўнай дысцыпліне.

Бясспрэчна, сказаў Куйбышаў, што ў галіне працоўнае дысцыпліны ёсьць асобныя трывожныя зьявішчы. Яны, зразумела, ня тыповыя для ўсяе прамысловасьці і ня маюць масавага характару. Усё-ж такі нельга заплюшчваць вочы на факты, а належыць в усёю вастротою паставіць пытаньне аб узмацненьні працоўнае дысцыпліны. Нездарма нядаўні пленум ЦК партыі ў сваіх рэзалюцыях высоўвае дырэктыву аб патрэбе змагацца з расхлябанасьцю і прагуламі ў прамысловасьці. Трэба прызнаць, што некаторыя гаспадарцы ня маюць належнага падыходу да рабочага пытаньня. Але бясспрэчна і тое, што асобныя прафарганізацыі выказваюць тэндэнцыі недаацэньваць ненармальных зьявішчаў у галіне працоўнае дысцыпліны. Зусім ненармальна, калі на некаторых прадпрыёмствах фактычна праводзіцца выбарчая сыстэма ў адносінах да кіраўнікоў цэхаў. Гэта прыводзіць да таго, што кіраўнікі прадпрыёмстваў пазбаўлены магчымасьці падбіраць працаўнікоў і з гэтае прычыны ня могуць несьці адказнасьці за працу. Вытворчыя нарады на прадпрыёмствах ня вельмі актыўна кіруюцца з боку прафарганізацый. Трэба пятугамі гаспадарчаў, і, у першую чаргу, прафсаюзаў, пераварыць у гушчы кадравага пралетарыяту тыя масы рабочых на прадпрыёмствах, якія прышлі з вёскі. Гэта таксама павінна адбівацца на працоўнай дысцыпліне.

Пленум, узяўшы за аснову тэзісы дакладу Куйбышава, даручыў камісіі выпрацаваць рэзалюцыю на дакладу, узяўшы пад увагу выказаныя ў спрэчках пажаданьні.

2-я ПАЗЫКА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ РЭАЛІЗАВАНА АМАЛЬ ПОЎНАСЬЦЮ.

ПАДПІСКА НА ВЁСЦЫ БУДЗЕ ЦЯГНУЦЦА ДА 1 СТУДЗЕНЯ.

МАСКВА. Водлуг вестак Наркамфіну СССР, агульная сума падпіскі на другую пазыку індустрыялізацыі перавысіла плян амаль што на 19 проц., даўшы дагэтуль блізка 472-х мільёнаў, з якіх на РСФСР прыпадае 340 мільёнаў, УССР—87 з паловаю мільёнаў. і г. д.

* * *

МАСКВА. Старшыня центральнае камісіі дапамогі рэалізацыі пазыкі Талаконцаў зазначыў на слабы ўдзел вёскі ў падпісцы на пазыку ў параўнаньні з гарадам. Тэрмін рэалізацыі пазыкі сярод сялян адкладзен з гэтае прычыны да 1 студзеня. Сьнежань трэба выкарыстаць, каб найбольш ахапіць падпіскаю сялянскае мы харства. Кампанію падпіскі на пазыку трэба ўвязаць з кампаніяй перавыбараў саветаў, не дапушчаючы ніякага прымусу і адначасна адбіваючы ўсякі адпор кулацтва проці размяшчэньня пазыкі на вёсцы.

Лічбы с.-г. пралетарыяту.

(На ўсесаюзным зьезьдзе с.-г. рабочых).

МАСКВА. На ўсесаюзным зьезьдзе сельска-гаспадарчых і лясных рабочых старшыня саюзу Андаровіч у сваім дакладзе, між іншым, зазначыў, што саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых зьяўляецца авангардам рабочае клясы на вёсцы. У зьвязку з гэтым адною з галоўных задач саюзу зьяўляецца праца па ўцягненьні ўсяе масы парабкоў, пастухоў і драваскаў у саветы і каапэрацыю. Гэты актыў павінен быць перадавым у барацьбе з кулацкімі элементамі вёскі. Сельска-гаспадарчыя і лясныя рабочыя павінны агітаваць за калектывізацыю сельскае гаспадаркі.

Сэкратар ЦК саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых паведаміў у дакладзе, што, водлуг апошніх даных, у саюзе налічваецца 1.364.000 сяброў. У сучасны момант саюз ужо ахапіў значныя масы парабкоў. Аднак, рост саюзу яшчэ малы, бо ў сельскай і лясной гаспадарцы працуе па найму ня менш 5.400.000 чалавек, з якіх толькі ў савецкіх гаспадарках занята на пастаяннай, сэзоннай і часовай працы 588.000 чалавек, а ў сялянскіх гаспадарках і прадпрыёмствах с.-г. прамысловасьці—больш 2 мільёнаў рабочых.

КРЭДЫТЫ ДЛЯ СССР У АУСТРЫІ.

ВЕНА. З некаторага часу аўстрыйскі капітал удзельнічае ў фінансаваньні савецкага вывазу, пераважна, яек. Як паведамляе «Нэйе Фрэйе Прэсэ», цяпер мяркуецца наладзіць гэтае фінансаваньне на больш шырокай базе. СССР праводзіць зараз перамовы наконт наданьня аўстрыйскімі фінансістамі крэдыту ў 750 тысяч даляраў, які будзе гарантаваны Савецкім Саюзам. Апроч таго, Аўстрыя дае Савецкаму Саюзу тавары крэдыт. Крэдыты будуць дадзены СССР увосень 1929 году да лета наступнага году.

ПРЫЗЫЎ ЗАПАСНЫХ У БЭСАРАБІІ.

ВЕНА, 27-XI. Водлуг паведамленьняў «Дымінэаца», у некаторых паветах Бэсарабіі абвешчан прызыў запасных ад 30 да 40 гадоў, прызнаных у свой час нягодным да вайсковае службы. Прызваныя залічваюцца ў бэсарабскія палкі на 4-хгадовы тэрмін. Прызыў гэты праводзіцца, абмінаючы закон аб вайсковай службе, і выклікае ў жыхарства вялікае нездаволеньне.

Чырвоная армія на перавыбарах саветаў.

МАСКВА. Палітычная управа Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі разаслала ўсім палітычным органам абежны загад аб удзеле Чырвонае арміі ў кампаніі па перавыбарах саветаў. Палітычныя органы і партыйныя арганізацыі павінны ўжыць усе захады, каб абярнуць перавыбары ў наступ на нашых клясавых ворагаў, каб поўнасьцю заўладаць палітычнымі настроямі чырвонаармейцаў, дамагаючыся масавага разуменьня імі сутнасьці перавыбараў, як вельмі значнае палітычнае кампаніі, якая павінна выклікаць найбольшае згуртаваньне батрацтва і вясковае беднаты пад кіраўніцтвам рабочае клясы, а таксама саюз з серадняком, для адпору кулацкім і антысавецкім элементам.

„Нас пасылаюць у партыю беспарт. масы"

АРЦЁМАЎСК, 28-XI. Раённая партыйная канфэрэнцыя ў Арцёмаўску зазначае на рост цягі рабочых у партыю. У акрузе за апошні тыдзень у партыю пададзена 500 заяў ад рабочых.

Рабочыя ў каментыўных завах, між іншым, пішуць: «Нас пасылаюць у партыю беспартыйныя масы пралетарыяту. Іх нака: ні кроку ад пастаноў XV партзьезду, за ўзмацненьне індустрыялізацыі краю».

Выканаць дырэктыву аб зьніжэньні сабекошту.

МАСКВА. У загадзе па ВСНГ СССР за подпісам Русіновіча даецца ўсім гаспадарчым органам дырэктыва абавязкова выканаць намечанае на сёлетні гаспадарчы год зьніжэньне сабекошту прадукцыі НА 7 ПРОЦ. Выкананьне гэтае дырэктывы, зазначана ў загадзе, зьяўляецца галоўнаю ўмовай для ажыцьцяўленьня ня толькі пляну капітальных укладаў, але і ўсяго гаспадарчага пляну бягучага году.

Блізкае абвастрэньне япона-кітайскіх адносін.

ШАНХАЙ, 28-XI. Міністр фінансаў нанкінскага ўраду Суй-Цзэ-Вэнь заявіў, што ўрад, якому патрэбны сродкі для правядзеньня рэформ і ўзмацненьня ўлады Гаміндану, ня будзе больш чакаць выніку япона-кітайскіх перамоў і абвяшчае 1 сьнежня новыя тарыфы, якія набудуць правамоцнасьць з 1 лютага. Суй-Цзэ-Вэнь падкрэсьліў, што ўсе дзяржавы, апроч Японіі, або падпісалі па прыкладу Злучаных Штатаў тарыфы-згоды з Кітаем, або заявілі аб сваёй згодзе падпісаць такія ўгаворы.

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ЎЛАДЫ КАНТОНУ.

ШАНХАЙ, 26-11. Лі-Ці-Сін падаўся ў адстаўку з пасады старшыні гуандуньскага правінцыяльнага ўраду. Нацыянальны ўрад згадзіўся з адстаўкаю Лі-Ці-Сіна і назначыў яго наступнікам генэрала Чэн Мін-Сю (бліжэйшы супрацоўнік Чан-Кай-Шы).

ПАДПІСАН ІТАЛА-КІТАЙСКІ ЎГАВОР.

ШАНХАЙ, 28-XI. Друк паведамляе, што падпісан італа-кітайскі ўгавор.

ТАЙНЫЯ АНГЛА-ЯПОНСКІЯ ПЕРАМОВЫ.

ШАНХАЙ, 27-XI. Газэта „Шунь-Бао" агалашае тэлеграму з Парыжу, у якой гаворыцца, што нядаўна між Англіяй і Японіяй адбываліся тайныя перамовы аб аднаўленьні англа-японскага саюзу, ня толькі дзеля разьдзелу Кітаю, але і для таго, каб перашкадзіць росту ўплыву Амэрыкі ва Далёкім Усходзе".

ТАЙНЫЯ ЎГАВОРЫ БЭЛЬГІІ І НАРВЭГІІ З КІТАЕМ.

ШАНХАЙ, 26-XI. Нарвэгія і Бэльгія падпісалі тайна згоды, якія прызнаюць тарыфную аўтаномію Кітаю.

МАСКВА—КУЗЬНЯ НОВЫХ ШЛЯХОЎ ДА ШЧАСЬЦЯ.

УРАЖАНЬНІ БЕЛГРАДЗКАГА ТЭАТРАЛЬНАГА ДЗЕЯЧА.

ВЕНА, 27-XI. Белградзкія газэты абвяшчаюць заяву дырэктара белградзкага драматычнага тэатру Гавэлы аб яго побыце ў Маскве, куды ён быў запрошан на сьвяткаваньне 30-цігодзьдзя мастацкага тэатру.

«СССР,—заяўляе Гавэла,—як вусім правільна выказаўся Луначарскі, кузьня новае тэатральнае культуры для ўсяго сьвету... Масква—гэта горад—, піша далей Гавэла,—які нельга параўнаць ні з якою іншаю сталіцаю. Там адчуваецца заснаваньне новых шляхоў для новага жыцьця ўсяго сьвету».

Нямецкіх тэкстыльшчыкаў чакае лёкаут.

БЭРЛІН, 28-XI. Фабрыканты тэкстыльнае акругі Эльдэрвэльд абвясьцілі аб скасаваньні імі тарыфных угавораў з 1-га студзеня.

Рост францускага вайсковага бюджэту.

ПАРЫЖ, 28-XI. Палата дэпутатаў распачала абмяркоўваць вайсковы бюджэт. Дакладчык паведаміў, што выдатковая частка бюджэту вызначана ў суме 6532 мілёны франкаў. Гэта складае прырост, у параўнаньні з 1928 г., на 790 мілёнаў.

Імпэрыялісцкае падарожжа Гувэра

ПАД АХОВАЮ ГАРМАТ ДРЭДНОЎТА.

НЬЮ-ЁРК, 28-XI. Гувэр прыехаў у Корынта (Нікарагуа), прабыў на ўзьбярэжжы вельмі нядоўга і вярнуўся на дрэдноут. Прыём прэзыдэнта Нікарагуа адбыўся на дрэдноўце, бо баяліся, каб на ўзьбярэжжы ня здарыліся «непажаданых» інцыдэнтаў.

ЗАКЛІК У МЭКСІКАНСКІМ ПАРЛЯМАНЦЕ ДА САЛІДАРНАСЬЦІ З САНДЫНО.

МЭКСІКА, 28-XI. Камуніст Ляборд выкрыў у палаце дэпутатаў імпэрыялісцкую падапляку падарожжа Гувэра ў краі Лацінскае Амэрыкі. Усьнімаючы сьцяг, адабраны нікарагуанскімі паўстанцамі Сандыно ад амэрыканскіх інтэрвэнтаў, Ляборд патрабаваў, каб краі Лацінскае Амэрыкі абвясьцілі сябе салідарнымі з Сандыно пасьпешныя апэрацыі якога сьведчаць пра магчымасьць агульнае барацьбы проці агульнага ворага.

Дэпутат Гомэц, блізкі да прэзыдэнта, заявіў, што Сандыно даў сьвету такі урок, які прымусіць задумацца можнага раней, чымся нападаць на Мэксіку, але няма для чаго парушаць добрых адносін са Злучанымі Штатамі. Мы вітаем прыезд Гув

Клясавы характар статыстыкі буржуазных краёў.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Т. КРЫЦМАНА НА ЖЭНЕУСКАЙ СТАТКАНФЭРЭНЦЫІ.

БЭРЛІН. 26-га лістапада ў Жэневе пачалася скліканая Лігаю Нацый міжнародная канфэрэнцыя па пытаньнях эканамічнае статыстыкі. Удзельнічаюць прадстаўнікі ад 40 дзяржаў.

Сёньня прадстаўнік СССР—сябра калегіі ЦСУ СССР - Крыцман у сваім дакладзе адзначыў, што праэкт статыстычнае згоды, выпрацаваны камісіяй, мае выразны сьлед уплыву эканамічных інтарэсаў асобных капіталістычных груп і асоб. Праэкт аддае вельмі мала ўвагі прамысловай і сельска-гаспадарчай статыстыцы і абыходзіць моўчкі статыстыку працы, нагэтулькі важную для ўсіх сацыяльных канфліктаў. Рашаючае значэньне ў справе разброеньня мае статыстыка вырабу зброі і вайсковых матар'ялаў. Нажаль, Ліга Нацый адхіліла адпаведныя прапановы савецкае дэлегацыі. Наадварот, трэба непакоіцца, што статыстычны матар'ял, сабраны на падставе намечанае згоды, можа быць выкарыстаны таксама і для прыстасаваньня эканамічных рэпрэсій, прадугледжаных статутам Лігі Нацый.

Спрабуючы адказаць Крыцману, старшыня канфэрэнцыі, прафэсар Раппард не знайшоў чаго сказаць, апроч таго, што ў матар'ялах канфэрэнцыі няма вінных намёкаў на эканамічныя рэпрэсіі, і што папраўкі, якіх дамагаецца Крыцман, датычаць кампэтэнцыі міжнародных установ, напрыклад, сельска-гаспадарчага інстытуту ў Рыме і міжнароднага бюро працы—у Жэневе.

НЯМЕЦКАЯ ГАЗЭТА АБ ВЫСТУПЛЕНІІ КРЫЦМАНА.

БЭРЛІН. 28-XI. Жэнеўскі карэспандэнт «Кельнішэ Цэйтунг» зазначае, што даклад Крыцмана зьяўляецца сэнсацыяй міжнароднае статыстычнае канфэрэнцыі, і што гэта быў першы даклад савецкага дэлегата Жэневе, зроблены на расейскай мове. Газэта піша: «Можна ізноў павіншаваць савецкіх дзеячоў, бо яны на гэты раз выкарысталі запросіны ў Жэневу палітычна разумна і мэтазгодна».

Матар'ялы для дакладу аб дзесяцігодзьдзі 1-га зьезду работніц і сялянак.

1. Дзесяць год таму назад, да 1-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, быў скліканы 1-ы зьезд работніц і сялянак. Малая, яшчэ не ўзмацніўшаяся тады, савецкая ўлада перты раз зьвярнулася да жаночай прапоўнай масы з заклікам стаць ва абарону Кастрычнікавых заваёў ад замаху шматлікавых ворагаў. Задача першага зьезду заключалася ў тым, каб скалыхнуць жаночую прапоўную масу, выклікаць яе актыўнасьць і вакіраваць яе на лагву сацыялістычнага будаўніцтва. Работніцы і сялянкі за 10 год змаглі вылучыць вялікую колькасьць карысных і патрэбных краіне працаўнікоў. Абуджаны да грамадзкага жыцьця, уцягнуты ў сацыялістычнае будаўніцтва вават самыя цёмныя і адсталыя, самыя забітыя і прыгнечаныя прапаўніцы з самых глухіх вёсак вялікай Савецкай краіны.

2. 1-ы зьезд работніц і сялянак у сваёй рэзалюцыі адзначыў, што ў прапоўнай жанчыны не павінна быць сваіх асабістых жаночых арганізацый у сувязі і з тым, што задачы яе тыя-ж самыя, што і ўсяго пралетарыяту, але, з прычыны адсталасьці жаночых прапоўных мас, зьезд прызнаў неабходным весьці ўзмоцненую агітацыю і прапаганду сярод жанчын. З гэтай мэтай хутка пасьля зьезду пры ЦК Партыі і пры партыйных камітэтах былі арганізаваны асобныя камісіі па прапагандзе і агітацыі сярод жанчын.

ЦК РКП(б) у сваім першым абежным лісьце аб рабоце сярод жанчын, разасланым партыйным арганізацыям пасьля зьезду, ставіць перад камісіямі па агітацыі і прапагандзе сярод жанчын наступныя 2 задачы:

а) першай і грунтоўнай іх задачай зьяўляецца палітычнае выхаваньне работніц, абуджэньне іх сьвядомасьці (уцягненьне іх у камуністычную партыю, прыцягненьне іх да рэвалюцыйнай барацьбы на ўсіх яе формах і выяўленьнях, у тым ліку і на фронце;

б) другой задачай камісіі па прапагандзе й агітацыі сярод работніц зьяўляецца прыцягненьне работніц да справы будаўніцтва новага жыцьця. Камісіі павінны дапамагчы работніцы разабрацца ў гэтай рабоце і навучыць яе праводзіць, з гэтай мэтай неабходна больш прыцягваць работніц да работы ў саветах, заводзкіх і фабрычных камітэтах, праўленьнях прафсаюзаў і г. д.

У 1919 годзе камісіі па прапагандзе і агітацыі былі рэарганізаваны ў аддзелы па рабоце сярод работніц і сялянак, або жаноддзелы.

У БССР, акупаванай да восені 1918 г. імпэрыялістычнай Нямеччынай, арганізаваная работа сярод жанчын пачалася некалькі пазней. Камісіі па агітацыі і прапагандзе сярод жанчын былі складзены толькі ў пачатку 1919 г. З прыходам беларалякаў у БССР работа партыі сярод жанчын заглохла. Толькі восенью 1920 г., пасьля канчатковага вызваленьня нашай краіны ад панаваньня буржуазна-абшарнай Польшчы, зноў пачынаецца гэта работа і арганізоўваюцца жаноддзелы.

Жаноддзелы да гэтага часу ўсё яшчэ зьяўляюцца неабходным апаратам партыі на прыцягненьню работніц і сялянак у сацыялістычнае будаўніцтва і падрыхтоўкі іх да справы кіраўніцтва краінай. Да дзесяцігодзьдзя работы партыі сярод жанчын у значнай ступені ажыцьцёўлен лёзунг, дадзены нам Леніным у яго выступленьні на 1-м зьезьдзе работніц і сялянак—„Кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай".

3. За дзесяць год маюцца значныя посьпехі ў прыцягненьні работніц і сялянак ва ўсе віды сацыялістычнага будаўніцтва. У складзе гарадзкіх саветаў па СССР проц. жанчын узрос з 5,7 проц. у 1920 г. да 21,4 проц. у 1927 г.; у сельсаветах—з 1 проц. у 1922 г. да 11,8 проц. у 1927 г.; у складзе ЦК Прафсаюзаў з 4,2 проц. у 1923 г. да 15,5 проц. у 1927 г.; у ФЗМК з 14,4 у 1923 г. да 19,2 проц. у 1927 г. На лініі спажывецкай кааперацыі нагледзецца таксама рост: на 1-X-25 г. па сельскай спажывецкай кааперацыі кааперавана жанчын 468200 ч., альбо 9,3 проц. к агульнаму ліку найміцыкаў; на 1-X 27 г. ужо ахопленa 1.165.600 або 12 проц. Па рабоча-гарадзкіх спажыв. таварыствах на 1-X-25 г кааперавана 874700 жанчын, або 23,3 проц. да агульнай колькасьці найміцыкаў; на 1-X-27 г.—кааперавана 1.481.600 жанчын, або 27,1 пр.

А па БССР мы таксама можам адзначыць вялмала дасягненьняў у гэтым напрамку. Так, у складзе гарсаветаў мы маем у 1928 г. 581 жанчыну, або 14,8 проц., у складзе прэзыдыумаў гарсаветаў—24 жанчыны, або 9,4 проц. да агульнай колькасьці членаў прэзыдыумаў гарсаветаў, у складзе ЦВК БССР—11 членаў і 4 кандыдаты работніц. У сэкцыях гарсавету па 4-х акругах БССР (Бабруйскай, Аршанскай, Гомельскай і Полацкай) жанчын больш 21 пр, у сярэднім Сялянак членаў сельскіх і местачковых саветаў—1821 чал.

На ніавой прафсаюзнай рабоце мы мелі ў 1928 г.—6630 чал., членаў ФЗМК на 1-IV-28 г.—1537 (па няпоўных даных). Па акруговых праўленьнях маем 204 ч. Прамант жанчын у складзе пленуму ЦСПСБ—18,5 пр. да агульнага складу членаў. Расьце таксама ахоп жанчын прафсаюзамі БССР. Так, на 1-IV-27 г. іх было 54115 ч., або 24,4 проц. усяго ліку членаў профсаюзаў, а ў красавіку 1928—58688, або 25,3 проц. Батрачак і сел.-гас. работніц было арганізавана ў 27 г. 5033 ч., у чэрвені 1928 г.—7714. На 1-IV-28 г. кааперавана 53,1 пр. жанчын — членаў прафсаюзаў супроць 22,5 проц. мінулага году. Спажывецкай кааперацыяй кааперавана жанчын у гораде 27090, або 22,4 проц. да агульнага ліку кааперованых, на вёсны — 44039, або 10,1 проц. Па 40 калектыўных гаспадарках мы маем 10.708 або 51,2 проц. усіх членаў. Актыў работніц у кааперацыі наступны: упаўнаважаных і членаў крамных камісій—900 чал. Вёска яшчэ значна адстае ад гораду. Так, у вясковай спажыв. кааперацыі членаў праўленьняў (па 580 т-вах) упаўнаважаных (па 320 т-вах), членаў крамных камісій (па 328)—2413 чалавек. У праўленьнях сельска-гаспадарчай і крэдытнай кааперацыі проц. удзелу жанчын павялічыўся з (0,6 проц. у 1925-26 г. да 2,2 проц. у 1927-28 г.). У праўленьнях саюзу калгасаў мы маем 16,6 проц. і ў савеце 15,3 проц., у савеце Белсельсаюзу—11,3 проц., у праўленьнях малочнай і жывёлаводчай кааперацыі жанчын—20 проц., а ў савеце іх—38 проц.

У дзесятую гадавіну жаноддзелу павінен быць высунут лёзунг: «пагалоўны ўдзел работніц, батрачак і шырокіх мас сялянак-бяднячак і сераднячак у выбарах у саветы». Большае ўцягненьне работніц і сялянак у работу саветаў, прафсаюзаў, кааперацыі, камітэтаў узаемапамогі, паляпшэньне работы абравага актыву і большае прыцягненьне сялянак, у першую чаргу бяднячак і батрачак у работу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ўзмаганьне ўдзелу жанчын у тых відах кааперацыі, у якіх больш усяго ўхываецца жаночая праца, як малочная, сыраварная, птушкаводная і г. д.

4. Першы зьезд прыняў шэраг важных пастаноў па пытаньню вызваленьня жанчыны. Першае, аб чым паклапацілася савецкая ўлада, гэта—паменшыць няжасьць мацярынства, забясьпечыць дзіцяці ўмовы вармальнага выхаваньня, мацеры—умову для работы бяз шкоды для яе здароўя. Сетка ўстаноў аховы мацярынства і дзяцінства ў гарадох вырасла па БССР пры актыўным удзеле работніц і сялянак да 1927 г. да 1838. У апошнія гады сялянкі прыцягваюцца да будаўніцтва летніх ясьляў, якіх у вёсках па Саюзу ССР летам 1928 г. было 6000. За апошнія гады разгарнулася ў буйных прамысловых цэнтрах арганізацыя грамадзкіх сталовак, фабрык-кухань, абслугоўваючых дзесяткі тысяч працоўных. Па БССР мы маем 26 сталых ясьляў на 1000 дзяцей, з іх 9 ясьляў працуючых на буйных прадпрыёмствах БССР («Дзьвіна», „Днепр", «Везувій» і інш.), шмат працуюць у дзьве зьмены, 29 кансультацый для цяжарных (11 у гарадох і 18—у раёнах). кансультацый для дзяцей у гораде 16, у вёсцы 47, якія абслужылі за 1927 г. больш 80 проц. нарадзіўшыхся дзяцей у гарадох. Пры кансультацыях ёсьць таксама малочныя кухні. Ясьляў на вёсцы ў 1928 годзе было 290, з іх на сродкі грамадзкіх арганізацый 35, дзіцячых пляцовак у 1928 г. 165, з іх на сродкі грамадзкіх арганізацый 16.

У 1927-28 г. колькасьць дзіцячых садоў дасягнула 49 у гарадох, і 32 ў вёсцы; ачагоў—14 у горадзе і 3 ў вёсцы. Пляцовак у гарадох 123. Пры клюбах пачынаюць наладжвацца дзіцячыя пакоі. У 1927 г. утворана такіх пакоў 5, у 1928—10.

Характэрна, што значная колькасьць ясьляў і пляцовак арганізавана на сродкі грамадзкіх устаноў і сродкі насельніцтва.

Але гэтыя дасягненьні як па ўсяму СССР, так і па БССР далёка недастатковы для поўнага вызваленьня жанчыны. У дзесятую гадавіну жаноддзелаў мы павінны высунуць лёзунг: больш узмоцненае будаўніцтва ясьляў, дзіцячых кансультацый, дзіцячых садоў і пляцовак у горадзе і на вёсцы, будаўніцтва пральняў, кухань і іншых устаноў, паляпшаючых быт працоўнай жанчыны, вызваляючых яе ад хатніх клопатаў, стварачых умовы для яе ўдзелу ў вытворчасьці, у грамадзкім жыцьці, у сацыялістычным будаўніцтве.

Ажыцьцяўленьне агульных задач індустрыялізацыі краіны, тэхнічны ўздым забясьпечыць далейшае разгортваньне работы па вызваленьню працоўнай жанчыны і рэарганізацыі ўсяго нашага быту. Больш самадзейнасьці работніцы і сялянцы ў складаньні гэтых устаноў, у паляпшэньні іх работы.

VIII усебеларускі зьезд працаўнікоў асьветы

Спрэчкі па дакладу ЦП саюзу.

Па дакладу Цэнтральнага Праўленьня пасьпела выказацца 25 чалавек. Спрэчкі насілі характар здаровай крытыкі недахопаў у саюзнай працы і ўказвалі шляхі для іх выпраўленьня.

— Мы ведаем, што гурткавая праца настаўнікаў не задавальняе, асабліва па палітпытаньнях. З году ў год гурткі прапрацоўваюць адно і тое. Праграмы вельмі сухія і наогул гурткавая праца ня клеіцца. Трэба лепш узяць напрамак на палітшколы і кароткатэрміновыя курсы.

— Асьветнікаў часта абвінавачваюць у нежаданьні падвышаць сваю прафпісьменнасьць. Між тым, кажа т. Шумейка, наша прафлітаратура па зьместу нязвычайна суха напісана.

ЦП яшчэ ня вывучыла пытаньняў культпрацы, мала цікавілася і вывучэньнем быту асьветнікаў. Між тым у быту мы маем шэраг «кур'ёзов". Сядзіць настаўнік на антырэлігійным вечары, а яго жонка ў той час запальвае лямпаду.

— Адсутнічае і спайка паміж розных колаў асьветнікаў, у нас існуе дэхаўшчына: настаўнікі сацыяльна трымаюцца асобна, палітпрацаўнікі асобна і тэхпрацаўнікі таксама. Сэкцыя навуковых працаўнікоў ня мае свайго твару. Чаму, кажа адзін з дэлегатаў, на „Старонцы асьветніка" ў «Сьв. Беларусі" мы ня бачым навуковых працаўнікоў.

Тав. Лукашка гаворыць, што ахова працы ў саюзе асьветнікаў стаіць куды горш, чым па іншых саюзах. Ніхто ня цікавіцца як і ў якіх умовах працуе асьветнік.

— Лёс настаўніка знаходзіцца ў руках загадчыка школы і інспэктара нарасьветы, а таму ў нашых шэрагах бачым падхалімства. Калі ёсьць падхалімства, значыцца ёсьць і бюракратызм, якому патрэбен падхалім. Ёсьць таксама шэраг працаўнікоў «нейтральных», якія разважаюць- мая хата з краю. Гэта нэйтральнасьць кепска адбіваецца на нашай працы.

— Трэба больш увагі зьвярнуць на жывую сувязь ЦП з акругамі, а апошніх з райёнамі, толькі тады мы зможам як належыць кіраваць саюзнай працай і выпраўляць недахопы.

— Мала зварачаем увагі пытаньню вылучэньня жанчын на адказную працу. Да 50 проц. усяго складу саюзу, кажа т. Коблекс, у нас жанчыны, а на адказнай прафсаюзнай працы іх вельмі мала. На адміністрацыйнай-жа зусім няма. Трэба ЦП падумаць аб падрыхтоўцы кадраў культурніц для вылучэньня на адказную прафэсыйную і адміністрацыйную працу.

Тав. Калюта ставіць рашуча пытаньне аб тым, каб нашы саюзныя і адміністрацыйныя арганізацыі адмовіліся ад габінэтных мэтадаў працы. Усе пытаньні павінны ставіцца на шырокае абгаварэньне асьветніцкіх мас.

Перакідкі і звальненьні ўсё яшчэ нэрвуюць нашых асьветнікаў, але віну ўскладваюць на свае нізавыя саюзныя арганізацыі, якія не праяўляюць належнай цьвёрдасьці ў гэтым пытаньні.

Беспрацоўе ў саюзе досыць значнае. Трэба палепшыць культабслугоўваньне беспрацоўных, трэба падумаць аб іх пераквалёфікацыі і аб матар'яльнай дапамозе з боку саюзу.

Не засталося ніводнага пытаньня саюзнай працы, якое-б ня было абгаворана зьездам.

Некалькі таварышоў выказаліся за выданьне сваей настаўніцкай газэты. Выказаліся і супроць выданьня. Тав. Каваленка кажа—вельмі добра мець сваю газэту, але калі будзе мець вялікі дэфіцыт і пакрываць яго за рахунак сродкаў акруговых праўленьняў, дык лепш самастойнай газэты не выдаваць, бо нам ня будзе сродкаў на вядзеньне культпрацы.

Падымалі дэлегаты зьезду пытаньне і аб павялічэньні зарплаты адсталым групам асьветнікаў, а таксама і інспэктароў нарасьветы.

Заключнае слова тав. Платуна.

У заключным слове т. Платун коратка спыняецца на працы кас узаемадапамогі. Працуюць яны здавальняюча, але няма калектыўнасьці і вялікая запазычанасьць—вось недахопы нашых кас. Дрэнна працуюць у нас яшчэ рэвізійныя камісіі мясцкомаў і ў некаторых акпраўленьнях.

Праўда, прадстаўнікі ЦП мала выяжджалі на месцы. Трэба будзе кіравацца апошняй дырэктывай партыі, каб адказныя працаўнікі выяжджалі на месца для практычнай працы на 1-1½ месяцы.

Ніякай кампаніі ўкамплектаваньня школ не павінна быць. Трэба раз на заўсёды скончыць з васеньнімі пералётамі настаўнікаў. Трэба рашуча біць па руках тых, хто ставіць пытаньне аб штогоднім пераўкамплектаваньні. Без падстаў ніхто ня можа ні зволіць, ні перакінуць настаўніка.

Трэба нам наладзіць працу дамоў асьветы, пашырыць ячэйкі бязбожнікаў і паглыбіць працу апошніх. Некаторыя таварышы скардзіліся, што не атрымоўваюць дзеці настаўнікаў стыпэндый. Нашы ВНУ ўкамплектаваны беднякамі і пралетарскім складам, а таму ўсім стыпэндый ня можа хапіць.

Кепска ў нас яшчэ пастаўлена піанэр-праца. Саюз дабіўся ўвядзеньня ў штат сямёхгодак адзінкі для піанэр-працаўніка і будзе яе адстайваць.

Далей т. Платун спыняецца на пытаньні вызываўчай працы. Настаўнікі II канцэнтру лічаць, што выхаваўчую працу павінен весьці настаўнік грамадазнаўства. Гэта няправільна. Кожны настаўнік павінен весьці ня толькі выхаваўчую працу ў школе. Пытаньні антырэлігійнага выхаваньня, інтэрнацыянальнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня—гэта справа кожнага настаўніка.

Выступленьне камандуючага Бел. Вайсковай Акругі т. Ягорава.

З прывітаньнем ад імя часьцей Чырвонай арміі Беларускай Вайсковай Акругі на зьезьдзе асьветнікаў выступіў камандзір БВА тав. Ягораў, якога зьезд спаткаў гучнымі воплескамі.

— У краіне саветаў вядзецца напружаная праца па будаўніцтву сацыялізму. Мы павінны дагнаць і перагнаць тэхніку і прамысловасьць буржуазных дзяржаў. Наша сельская гаспадарка ў сваім росьце павінна гарманіраваць з тэмпам разьвіцьця прамысловасьці. Ясна, што гэта работа патрабуе аграмаднага напружаньня бюджэту, напружаньня сіл і энэргіі працоўных.

Пытаньне рэвалюцыі ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы ня можа быць вырашана бяз другой рэвалюцыі—культурнай рэвалюцыі. У культурнай рэвалюцыі на асьветніка выпадае вялікая і важная задача арганізаваць і паставіць падрыхтоўку каманднага складу для ўсіх галін нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Чырвоная армія непарыўна зьвязана з асноўнай масай асьветнікаў. У сілу розных аб'ектыўных прычын наша маладое папаўненьне Чырвонай арміі ня мае яшчэ базы тэхнічнай граматнасьці. Ні ў якім разе гэту віну нельга ўскласьці на асьветніка. Чырвоная армія можа сказаць, што асьветнікі ў падрыхтоўку рабоча-сялянскага маладняка ўкладваюць аграмадную працу.

У заключэньне т Ягораў выказвае ўпэўненасьць, што асьветнікі выканаюць задачы, якія паставіла перад імі Кастрычнікаўская рэвалюцыя.

Ад імя зьезду т. Шумейка запэўніў тав. Ягорава, што ў бліжэйшыя гады асьветнікі не дадуць ніводнага няпісьменнага байца ў Чырвоную армію.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальную тэлеграму Чырвонай арміі ў асобе Беларускай Вайсковай Акругі.

Да настаўніцтва і культурных працаўнікоў Зах. Беларусі.

УШ усебеларускі зьезд саюзу працаўнікоў асьветы БССР, які прадстаўляе 25.000 членаў саюзу—навуковых прадстаўнікоў, настаўнікаў, выхавацеляў дзіцячых дамоў і садоў, палітасьвет. працаўнікоў і тэхнпрацаўнікоў, сабраўшыся 26-XI-28 году для абмеркаваньня і вырашэньня шэрагу пытаньняў саюзнай вытворчай і грамадзкай працы асьветніка—шле Вам братэрскае прывітаньне.

Зьезд лічыць неабходным зьвярнуцца да Вас з гэтым лістом, як да працаўнікоў—культурнікаў, працуючых сярод прыгнечанага сацыяльна і нацыянальна беларускага прапоўнага народу, які знаходзіцца пад пятой польскага фашызму.

Мы культурныя працаўнікі Савецкай Беларусі, як частка агульнай сям'і працоўных пад сьцягам савецкай сыстэмы дзяржаўнасьці і пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, будуем новае жыцьцё сацыялізму. За кароткі гістарычны адрэзак часу мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, наша краіна мае вялізарнейшыя дасягненьні ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Буйны рост гаспадаркі, усё большае і большае разгортваньне сеткі культасьветных устаноў, усебаковае разьвіцьцё беларускай культуры і культуры ўсіх нацыянальнасьцей пражываючых на Беларусі рэарганізацыя Інстытуту Беларускай Культуры ў Акадэмію Навук, існаваньне шэрагу навукова-дасьледчых інстытутаў і катэдр пры іх, існаваньне чатырох вышэйшых навучальных устаноў, стварэньне ўмоў мірнага сажыцьця ўсіх нацыянальнасьцей, пражываючых на тэрыторыі БССР, разгортваньне сеткі школ нацменшасьцей: расейскіх, яўрэйскіх, польскіх, літоўскіх і латыскіх — зьяўляюцца лепшымі паказчыкамі адзінай—правільнай, самай дакладнай сыстэмы дзяржаўнасьці, якая толькі існавала ў гісторыі разьвіцьця чалавецтва.

Буйныя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам абуджэньня і кансаліданьні творчых сіл працоўных, якія выкліканы на барацьбу і перамогу Кастрычнікавай рэвалюцыяй.

Праўда, працоўным БССР цяжка было адбудоўваць нашу гаспадарку, нашу культуру. Мы атрымалі ў спадчыну ўсё разбуранае. Гэтая спадчына яшчэ і цяпер адчуваецца ў нашай працы, аднак, заряджаныя рэвалюцыйным энтузіязмам, мы ідзём уперад, перамагаючы цяжкасьці на нашым шляху.

Зусім інакшае мы назіраем у польскай, так званай, «дэмакратычнай» рэспубліцы.

Сусьветная вайна перакроіла дзяржаўныя межы. Польшча вызвалілася ад нацыянальнага ўціску, які панаваў больш чым стагодзьдзі. Польская буржуазея і паны, захапіўшы ўладу ў свае рукі і карыстаючыся спрыяючай сусьветнай сітуацыяй, захапілі шэраг этнаграфічна няпольскіх зямель. Гістарычны вурок не пайшоў на карысьць буржуазеі, абшарнікам і іх лёкаям згодніка. Яны ў самай Польшчы ўтварылі фашыскую сыстэму дзяржаўнасьці і пачалі праводзіць у этнаграфічна няпольскіх землях палітыку царскага ўраду, палітыку вешацеля Мураўёва. Польская буржуазея і паны абшарнікі зачынілі ўсе пачатковыя беларускія школы, якія існавалі ў перыяд 1919—21 году; яны бязупынна на працягу ўсяго часу вядуць агіднейшую камэдыю без пачатку і канца ў адносінах да просьб сялян аб дазволе адчыненьня беларускіх школ, яны навязваюць беларускім дзецям у школах чужую мову, што в пункту погляду педагогікі сурова забараняецца; яны фактычна разагналі таварыства беларускай школы, як масавай арганізацыі; яны разагналі 100-тысячную масавую арганізацыю сялянска-работніцкую грамаду; яны цераз дэфэзыву арганізуюць пабоі працоўных, як гэта было ў Косаве, Львове і іншых мясцовасьцях.

Зразумела, што гэтыя акты польскага фашыскага ўраду нельга інакш разглядаць, як царскую мураўёўскую палітыку, як акты, накіраваныя на поўную палёнізацыю краю, як зьдзек над прапоўнымі Заходняе Беларусі, як каленіяльныя адносіны ўраду да Заходняй Беларусі.

Праводзячы такую агідную палітыку да прапоўных Заходняй Беларусі, польскі ўрад, шляхам подкупаў і дачы некаторых палёгак па асобных адзінках і групах, якія былі зьвязаны з вызваленчым дробна-буржуазным і буржуазным рухам, хоча стварыць ілюзію вырашэньня нацыянальнага пытаньня. Здраднікі працоўных, прадажныя душы знаходзяцца, але працоўныя масы Заходняй Беларусі на практыцы пераканаліся, як вырашаецца нацыянальнае пытаньне польскім фашыскім урадам, і добра ведаюць, што толькі бязупынным, упартым змаганьнем, пад кіраўніцтвам сапраўдных прадстаўнікоў працоўных мас КПЗБ і Польшчы, разам з прапоўнымі і эксплёатуемымі ўсяе Польшчы—яны змогуць вызваліцца ад сацыяльнага і нац. ўціску.

Мы, асьветнікі Савецкай Беларусі, кажам: сацыяльны і нацыянальны ўціск—часовае зьявішча, жалезныя законы гісторыі вядуць да перамогі пралетарыят і да ўстаноўленьня ва ўсім сьвеце пралетарскай сыстэмы дзяржаўнасьці, як пераходнай стадыі да камунізму.

Вось чаму, паважаныя таварышы, мы, як атрымаўшы вопыт клясавай барацьбы, заклікаем вас, незалежна ад нацыянальнага паходжаньня, вязваць свой лёс з лёсам прапоўных, і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пайсьці на змаганьне з панамі, буржуазеяй і іх лёкаямі-згодзікамі.

У імя сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня, у імя лепшай будучыні прапоўных, у імя цывілізацыі і культуры заклікаем вас на гэту барацьбу.

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя—шлях да сьветлай будучыні чалавецтва!

Няхай жыве камуністычная партыя Заходняй Беларусі і Польшчы!

Пастанова Бюро Менскага Акружнога Камітэту ЛКСМБ

па справе на заводах „Домбаль" і „Бярэзіна".

1. БЮРО АК ЛКСМБ КАНСТАТУЕ, ШТО:

а) Факт, які здарыўся ў г. Нова-Барысаве і ў якім прымаў удзел камсамолец ДЗЯРУГА, зьяўляецца, бязумоўна, вышэйшым хуліганскім паступкам—«чубаровщиной», заслугоўвае самага шырокага грамадзкага асуджэньня' як з боку камсамольцаў, усёй рабочай моладзі, так і дарослых рабочых;

б) Дзяруга прымаў актыўны ўдзел у гнуснай, нечалавечай справе, якую тварыла група хуліганаў—згвалчаньне работніцы, канчатковa даказаў сваё разлажэньне, якое ня можа быць саумясьціма з імем камсамольца, а таму пастаноўлена зацьвердзіць пастанову Барысаўскага РК ЛКСМБ аб выключэньні яго з шэрэгаў саюзу.

2. Адзначыць, што з боку Барысаўскага РК ЛКСМБ былі прыняты своечасова належныя меры пасьля высьвядамленьня гэтага факту, дзеля отварэньня навокал гэтай справы належнай грамадзкай думкі ў шэрагу прадпрыёмстваў, сярод рабочай моладзі аб справе „чубаровцев", заслугоўваючай самага суровага асуджэньня.

БЮРО АК ЛКСМБ ПРАПАНУЕ:

1. Барысаўскаму РК ЛКСМБ высьветліць прычыны несвоечасовага рэагаваньня на факт з боку яч. зав. «Домбаль» і „Чырвоная Бярэзіна"—ці прычынай гэтаму зьяўляецца няведаньне гэтага факту, у выніку недастатковай сувязі з масай кіраўнікоў, ці з прычыны недаацэнкі данага факту, пасьля чаго прыняць належныя меры, аб якіх давесьці да ведама АК ЛКСМБ.

2. Высьветліць тэрмінова віноўнасьць у гэтай справе камсамольца Шаціла, пасьля чаго разглядзець яго справу.

3. На ўсіх ячэйках г. Барысава паставіць гэта пытаньне як кашмарны факт хуліганства, пасьля чаго разгледзець на пленуме РК.

4. На ўсіх вытворчых яч. г. Менску паставіць гэта пытаньне, увязваючы з пытаньнем барацьбы з хуліганствам.

Напярэдадні перавыбараў саветаў

НЯ ЎСЕ СЕЛЬСАВЕТЫ І РАЙВЫКАНКОМЫ ПРЫНЯЛІ НАЛЕЖНЫЯ МЕРЫ ДА РАЗГОРТВАНЬНЯ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ. АДСТАЎШЫМ ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА, КАБ ПЕРАВЫБАРЫ ПАЧАЦЬ У ТЭРМІН І ПАДРЫХТАВАНА.

Камсамольцы рыхтуюцца да перавыбараў саветаў.

(Рагачэўскі райён, Бабруйскае округі).

Камсамольцы Рыскаўскай ячэйкі ўжо распачалі падрыхтоўку до перавыбараў сельсавету. Па вёсцы правялі рэгістрацыю сялян выбаршчыкаў, якія маюць права ўдзельнічаць у перавыбарах і быць абранымі ў савет. Гутараць з сялянамі аб працы сяброў сельсавету, абгаварваюць пытаньне каб у час перавыбараў правесьці ў склад сяброў сельсавету працаздольных працаўнікоў.

У гутарках з некаторымі сялянамі выяўляецца, што сяляне намячаюць абраць актыўную беднату і камсамольцаў у склад новага сельсавету. Ня менш актыўны ўдзел прымуць камсамольцы і ў часе перавыбараў і у справаздачную кампанію, якая ўжо распачалася. Селькор З. Ток-ка.

ПАПЯРОВАЕ КІРАЎНІЦТВА КАМПАНІЯЙ.

(Ад нашага мазырскага карэспандэнта).

Інструктарскі апарат АВК распачаў праверку падрыхтоўчае працы па справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў як акруговых установах, так і ў РВК і сельсаветах округі. Для праверкі былі выдзелены 16 устаноў і арганізацый, з якіх 6 акруговых устаноў, 2 райвыканкомы і 8 сельсаветаў, з іх 2 нацыянальныя, 1 яўрэйскі і 1 польскі.

У выніку праведзенае праверкі аказалася, што ніводнае з акруговых устаноў да 4-га лістапада не далі ўказаньняў падпарадкаваным установам на пэрыферыі аб правядзеньні падрыхтоўкі і ўдзелу іх у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, ня гледзячы на тое, што ўсе кіраўнікі ўстаноў прысутнічалі на пленуме АВК, дзе распрацоўвалася пытаньне аб перавыбарах саветаў.

Па Каралінскаму райёну ўжо складзен календарны плян правядзеньня справаздач і перавыбараў. Пытаньне аб перавыбарах не абгаварвалася ні на пленуме РВК, ні на нарадзе старшынь і сэкратароў сельсаветаў, кіраўніцтва падрыхтоўчай працы з боку РВР ажыцьцяўлялася толькі пісьмовае, ды і то недастаткова.

Такім чынам з пададзеных даных відаць, што падрыхтоўка да такой палітычнай кампаніі ў нізавых савецкіх органах праводзіцца слаба. Калі з боку некаторых РВК дадзены своечасовыя дырэктыўныя ўказаньні сельсаветам, дык з боку сельсаветаў гэтыя дырэктывы яшчэ зусім не праводзяцца ў жыцьцё.

Завяроньні кіраўнікоў райёну і сельсаветаў аб тым, што тэрмін да правядзеньня справаздачна - перавыбарчай кампаніі застаецца яшчэ вялікі—3 тыдні, і за гэты час яны падрыхтуюцца, ня можа даць поўных гарантый за пасьпяховае правядзеньне як падрыхтоўчае работы, так і самае кампаніі, бо за гэты тэрмін, прымаючы пад увагу адначасовае правядзеньне іншых гаспадарчых кампаній (сельска-гаспадарчы падатак, страхоўка і інш.), шмат чаго зрабіць нельга.

Для таго, каб падрыхтоўка на нізох ішла больш шпаркім тэмпам і забясьпечыла пасьпяховае правядзеньне кампаніі, неабходна акруговым установам і РВК даць дырэктывы аб тым, каб зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на правядзеньне гэтае кампаніі, усклаўшы першапачатковую адказнасьць на кіраўнікоў устаноў і арганізацый.

Яўхім.

Кандыдатуры ўласьніка млына ў старшыні савету.

У некаторых райёнах Магілеўскай округі можна заўважыць узмоцненую актыўнасьць кулакоў у сувязі з падрыхтоўкай да перавыбараў саветаў.

У Высоцкім сельсавеце, Шклоўскага райёну, у склад выбарчай камісіі быў уведзены старшыня царкоўнага савету. Таксама ўстаноўлена, што кулакі і заможнікі таемна распачалі рыхтавацца да перавыбараў. У Антанікоўскім сельсавеце, Чавускага р. і Чорнаемскім сельсавеце, Магілеўскага р. кулацкая падрыхтоўка прыняла арганізаваны характар. У абодвых сельсаветах кулакі намецілі сваіх кандыдатаў у саветы. Цікава адзначыць, што ў Чорнаемскім сельсавеце кулакі арганізавалі свой «агітпроп» на млыне, дзе вядзецца агітацыя за «сваіх». Паміж іншым не пост старшыні сельсавету блёк кулакоў высоўвае ўласьніка млына.

ЛЁЗЬНЕНЦЫ—ПАДЦЯГНІЦЕСЯ, ПАКУЛЬ НЯ ПОЗНА!

Падрыхтоўчая работа да справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў Лёзьненскім райёне праходзіць з прахладцам.

Райённая выбарчая камісія складзена своечасова, але-ж яна па 20-XI г. г. зрабіла адно пасяджэньне. Складзены плян работы далёка не ахапляе ўсіх тых задач, якія стаяць перад камісіяй. Няма каляндарнага складу пасяджэньняў, выездаў на месца для інструктаваньня сельвыбаркомаў і г. д. Даклады сельвыбаркомаў не заслухоўваюцца, а таксама не праінструктаваны старшыні сельвыбаркомаў і рэвкамісій.

Выезды на месца прымацаваных сяброў райвыбаркому рабіліся за ўвесь час па адному разу і то не ва ўсе сельсаветы, але і калі-ж было выяжджаць, калі гэтыя-ж прымацаваньні да сельсаветаў былі зроблены толькі 12-га лістапада г. г.

Справаздача РВК яшчэ ня складзена і знаходзіцца ў стадыі падрыхтоўкі і як праходзіць падрыхтоўчая работа на с.-саветах райкамісія і РВК дакладных зьвестак ня мае.

Яшчэ ня склікаліся сходы беднаты, жанчын, батрацтва і акты

На суд савецкай грамадзкасьці.

Спачуваем таварышам з Віцебскай страхкасы...

Колькі часу інвалід Ладнёў Сьцяпан хадайнічае аб прызначэньні яму пэнсіі, колькі ім пройдзена кілёмэтраў пры вандраваньні з установы ў установу, колькі, урэшце, сьпісана паперы, —аб гэтым ні сам Ладнёў, ні віцебская акрстрахкаса ня скажуць.

Віцебская акрстрахкаса так нават забыталася ў гэтым пытаньні, што дзіву даешся—і як гэта людзі яшчэ жывы, як у іх не ўтварылася завароту казгоў...

І сапраўды, цягнуць валакіту ў працягу вялікага часу.

Куды толькі не зварочваўся гр. Ладнёў. Пісаў ён у страхкасу, пісаў у мясцовы акрвыканком, пісаў нават і тав. Калініну, а віцебская страхкаса...

31 мая 1928 г. за № 62140 піша ў Віцебскі акрвыканком:

...„Накіроўвая пры гэтым перапіску на гр. Ладнёва камітэт Вітакрстрахкасы паведамляе, што пэнсіённай справы на паказанага грамадзяніна ў касе ня маецца, а пагэтаму і вінкай адмовы ў пэнсіі гэты грамадзянін з страхкасы не атрымаў. Што датычыцца да пэнсіі гр. Ладнёву, дык паведамляем як прапусьціўшаму ўстаноўлены тэрмін на ісхадайнічаньне пэнсіі ён право на пэнсію згубіў".

Прыхоўваць тав. Ладнёў у акрвыканком даведацца, як стаіць справа з пэнсіяй.

— Ды вы, таварыш, з акрстрахкасы пішуць і право згубілі, і наогул не хадайнічалі...

— Як-жа я не хадайнічаў, як згубіў, ды я ўжо які час толькі і раблю, што аб пэнсіі хадайнічаю, нават ходзячы па пэнсію дзве пары ботаў ужо знасіў, а вы кажце—не хадайнічаю, абурыўся гр. Ладнёў.

Зноў паляцелі паперы, зноў яны запісваліся ў выходзячыя і ўваходзячыя..

Ужо 10 верасьня 1928 году зноў піша віцебская страхкаса ў акрвыканком:

... «гр. Ладнёў Сьцяпан права на пэнсію згубіў, так як ён спыніў працу ў 1923 годзе. У страхкасу з хадайнічаньнем аб прызначэньні пэнсіі да гэтага часу не зварачваўся»...

А Ладнёў чалавек упарты, усё пішэ і ўсё хадайнічае. Акрвыканком-жа ўсё «пажымае», каб скончыць валакіту і ўрэшце...

4-га кастрычніка 1928 году справа Ладнёва разглядаецца ў камітэце страхкасы, але лепш прыводзім выпіску з пратаколу.

„Слухалі інфармацыю т. Ізраіцеля аб тым, што інвалід Ладнёў у свой час узьняў перад намі пытаньне аб прызначэньні яму пэнсіі, але яму было адмоўлена, бо няма неабходнага працоўнага стажу. Потым ён ня раз хадайнічаў аб прызначэньні пэнсіі перад ЦВК СССР і акрвыканкомам. Апошні ў сучасны момант хадайнічае аб накіраваньні гэтай справы на канчатковае вырашэньне ў Галоўсацстрах".

Пастанавілі: згодна просьбы АВК справу гр. Ладнёва накіраваць на канчатковае вырашэньне Галоўсацстраху".

Спачуваем, таварышы віцебчане. Зараз ужо і чытачу відавочна, што ў вас „ун за разум зашел"...

Не хадайнічаў... І ў свой час узьняў пытаньне перад намі аб прызначэньні пэнсіі...

То згубіў права на пэнсію, а то ў яго няма працоўнага стажу...

Вось, далікатна кажучы, да чаго часам, валакіта нашых чыноўнікаў даводзіць...

Яшчэ раз спачуваем...

В. Зайцаў.

Спэц Таўбкін.

Бываюць часамі выпадкі, калі якога-небудзь, скажам, інжынэра-тэхналёга няма кім замяніць. Нават гэта яшчэ не характэрна. Вось яшчэ, калі, напрыклад, няма ў нас дырыжора аркестру. Тады мы едзем у Ленінград, наймаем дырыжора і плацім яму тое, што ён хоча. Нічога ня зробіш. Трэба. У такім выпадку нават РСІ нічога ня можа зрабіць за прыём на працу біз біржы, бо няма такіх спэцаў на біржы працы.

Нешта накшталт гэтага здарылася і з праўленьнем МЦРК.

Запатрэбіўся спэц. Трэба працаўніка, якога няма кім замяніць, і годзе. Што будзем рабіць? Туды, сюды—няма. Няма, бо спэцыяльнасьць, бачыце, новая. Пад такую рубрыку працоўныя Савецкай Беларусі віяк не падыходзяць. Нашоў-жа цяпер народ такі, што працу яму давай. Ня хоча цяперашні народ быць біз працы. Другому нават вызначы пэнсію, дык і то біз працы ня будзе яе атрымліваць. Сорамна, кажа, не працуючы грошы браць. І працуе.

Вось у гэтым і ўся бяда, што праўленьню МЦРК знадобіўся чалавек, які-б нічога не рабіў і спэц-стаўку атрымліваў.

Сюды, туды—няма. Аж зноў мічасьце Цэрабкопу—нашоўся Таўбкін.

З прычыны таго, што Беларусь мае новага спэца Таўбкіна, ня шкодзіць пазнаёміцца з яго біяграфічным нарысам:

Таўбкін нарадзіўся яшчэ да рэвалюцыі. Рэвалюцыйных здольнасьцяў прырода яму не падаравала. Таўбкін стаў эксплёататарам працы рабочых—быў уладаром заводу на Ляхаўцы. Завод быў нацыяналізаваны. Таўбкін стаў спэкулянтам. У гэтай працы яму перашкодзілі. Таўбкін стаў супрацоўнікам „Белселькустркредита". Пазбавілі яго права голасу. У зьвязку з гэтым, з працы прыйшлося яго звольніць. Цяпер Таўбкін за спэц-стаўку нічога ня робіць... у МЦРК.

Чаму нічога ня робіць? Дзіўнае пытаньне, бо ніколі ў сваім жыцьці нічога добрага не рабіў, элемэнт, значыць. А такі працаваць ня любіць. Вось і прыняло праўленьне ЦРК Таўбкіна на пасаду „наглядчыка" за гароднінай. А наглядчыкі, як вядома нічога ня робяць. Іх справа «наглядаць».

Які вывад, пытаецце? Ма' быць, у праўленьні МЦРК Таўбкін сваіх прыяцеляў мае, бо інакш на такую добрую пасаду прынялі-б працоўнага.

Сёма.

Тарасаў хоча ліквідаваць калгас

На замлі, заросшай хмызьняком і лазою, у 1925 годзе аселі на земляробства 5 ўкраінскіх сямей, стварыўшы калектыўную гаспадарку імя Вірчэнскага (у Слуцкім раёне).

Без усялякіх сродкаў вытворчасьці ўзяліся новыя людзі за сельска-гаспадарчую работу. Цяжка было наладжваць а нічога гаспадарку, але тут на дапамогу нашоў Наркамзем, аддаўшы ў крэдыт калгасу бліжэйшае возера „Князь».

Шпарка пайшло гаспадарчае ўпарадкаваньне калгасу. Зьявілася ў гаспадарцы 12 новых кароў, маладняк, новы дом новае гумно і іншыя надворныя будыніны. Жыцьцё пайшло сваім чарадом, пачало наладжвацца.

Але здарылася бяда. У студзені 1928 году здарылася прыдуха і рыба ў возеры падохла. Калгас 12 лютага паведаміў аб няшчасьці Наркамзем і ікаў інспэктара.

час ішоў, справа цягнулася, а інспэктар Наркамзеў Тарасаў зьявіўся ў калгас толькі 18 сакавіка. Запягнулі тоню, злавілі некалькі рыбін і на гэтай аснове Тарасаў заўважае, што рыбу лавіць можна і дагавор пакідаецца у моцы.

Вось тут і пачынаецца палута калгасу. З якойсьці прычыны Мазырскі Акрфінаддзел, пасьля паведаньня ў калгас Тарасава, пачынае прыціскаць калгас падаткамі, лічыць яго чамусьці «лжеколхозом».

Тарасаў вядзе сваю лінію. Ён патрабуе платы за аренду возера і за той час, калі арцель не працавала. Выпукваецца адкуль-та пеня, якой разам з арэндай платай набіраецца да 7 тысяч руб.

Тарасаў-жа вяршыць сваю справу. Рыбны інвэнтар арцелі, каштоўнасьцю ў 5 тыс. руб. перадаецца другой арцелі за 1500 руб.

Калгасу абяцаюць вярнуць інвэнтар пасьля ўплаты пені, але ня тут то было. Тарасаў і тут робіць пасвойму. Калгас выклікаюць у суд, судзяць апісваюць увесь дапчэнту інвэнтар і маемасьць, абвяшчаюць, таргі на продажу маемасьці

Праўда тут мяйсцовыя арганізацыі заступіліся за калгас абураныя такімі незаконнымі дзеяньнямі. Таргі былі адкладзены.

Але здань поўнага разгрому нісіць над калгасаўцамі. Той калгас, які раней, на сваёй маламоцнасьці, карыстаўся рознымі ільготамі: памяншэньнем арэндай платы за возера, растэрміноўкай плацяжоў, цяпер павінен спыніць сваё існаваньне, ліквідавацца з-за таго, што інспэктар Наркамзему Тарасаў узяў да яго строгую лінію.

Вымаганьне ўплаты 7 тысяч руб. у сучасны момант пагражае калгасу поўным развалам. Яшчэ так нядаўна калгас пацярпеў вялікія страты ад пажару (5000р.) і патрабуе сам дапамогі, а не вымаганьня ўплаты такой вялікай сумы, вялізарнай пені ні за што, ні пра што.

Калгасу трэба дапамогчы выйсьці з цяжкага матар'яльнага становішча, дапамагчы яму разьвівацца. Чыноўніку Тарасаву, які сваімі незаконнымі дзеяньнямі хоча давесьці калгас да развалу мы павінны сказаць:

Стой! Лягчэй на павароце.

А. Дамброўскі.

Бабруйшчына.

Абураючы выпадак у загатоўках.

Ворша, 29-11. Адзін селянін на рынку ў Воршы не згадзіўся здаць пуд валакна лёну за 8 руб. 50 кап. аддяленьню Белдаяржгандлю. Накіраваўся ён да с.-г. кааперацыі, дзе і заплацілі яму 9 р. 50 к.

Даведаўшыся аб гэтым, акруговы бракер тав. Якерсон накіраваўся туды для высьвятленьня прычын пераплаты. Калі спэц с.-г. кааперацыі абвясьціў бракеру, што лён прыняты як № 14, Якерсон меркаваў скласьці акт і перадаць валакно для аналізу.

Свае меркаваньні яму ня прышлося выказаць, бо спэц с.-г. кааперацыі накінуўся на Якерсона. Біў чым папала, нават кантар пайшоў у ход. Якерсон захварэў. Зараз ляжыць у больніцы. Хутка адбудзецца суд над зарваўшымися спэцамі.

Дружная „тройка".

Тры прыяцелі—загадчык вучастку сувязі і прараб Гарын, яго намоцнік Бялы і начальнік суднагляду Грушэўскі—вось тройка, якая моцна ўсталявалася на прыстані ў г. Мазыры. Усё ішло добра і насялжэньні, навучаныя на 6 гадзін у бытвасьць Бялага старшынёю мясцкому, пачыналися акуратна з такім разрахункам, каб да гадзіны 8 скончыць, каб пасьля можна было выпіць. Кожнае рэвалюцыйнае і рэлігійнае сьвята праводзілася з гарэлачкай. Так сабе жыла ціхая сямёнка з двух партыйнаў Бялага, Грушэўскага і беспартыйных Гарына і Храноўскага (начальніка прыстані). Ціха жылі яны сабе да таго часу, пакуль у Мазыр ня быў прысланы з Кіева электратэхнік т. Чэсакоў (член партыі).

За час сваёй працы ў мясцовае т. Бялы шмат чаго прарабіў. Скарачаюць адну тэлефаністку. Фракцыя мясцкому правяе скарацінь Краўчэнка, але яна—прыгожая жанчына, і Бялы піша пісульку, запрашае яе ўвечары пакатацца на лодцы, у гэтым яму дапамагае Грушэўскі (начальнік суднагляду) і намоцнік пракурора г. Мазыра Рыпікаў. І яе не скарачаюць, а замест яе скарачаюць Случак, потым Абрам, а ў выніку т. Фрыдман (бо «яна жыдоўка»).

Другі выпадак. Скарачаюць вартаўніка прыстані Нароўль т. Шустэрмана, які ў водным транспарце прапрацаваў ужо ізлых 20 гадоў. Бялы ня толькі не пярэчыць проці скарачэньня т. Шустэрмана, а нават калі сэкратар Нараўлянскага райкому КП(б)Б умяшаўся ў гэтую справу, дык Бялы сказаў: „Вось народ, жыд за жыда цягне" і у жніўні месяцы, калі суд адзавіў Шустэрмана на працы, Бялы выкручваецца хаваў, але не ўдалося, бо на судзе выявілася, што Бялы антысэміт у поўным сэнсе гэтага слова.

Трэці факт, калі рабочы Тыманенко паскардзіўся ў Кіеў на начальніка вучастку сувязі Гарына, ён яго скарацінь, а Бялы ня толькі не перашкаджаў, а нават выключыў яго з членаў саюзу.

У 1928 годзе пачалася праца па рамонту сувязі і вадашляху. Гарын, праводзіўшы гэтую працу, нарабіў шмат памылак, прычым ён часта піў. Былі нават такія выпадкі, калі Гарын п'яны бегаў па Нароўлі ў аднай бялізне і прымушаў тэлефаністак будзіць яго на тэлефону. Калі ён едзе на дачу, дык бярэ з сабою рабочага, які вязе яго сабачку.

Аб гэтых ненармальнасьцях т. Чэсакоў, як член партыі, паліччыў сваім абавязкам вапісаць у Кіеў, у РСІ, і ў газэту «Заводзкі Гудок». Тут-жа проці яго пачынаецца шалёнае паказаньне. Тройка бярэ курс на выжываньне Чэсакова і ў выніку яго скарачаюць. Але Чэсакоў, як член бюро ячэйкі, ставіць гэтае пытаньне на пасяджэньні бюро, якое пастаўляе выдзяліць камісію і праз 2 тыдні гэтая камісія атрымала матар'ял. Што-ж аказалася, што партыйны Бялы і Грушэўскі і Гарын (беспартыйны) систэматычна піялі, але, пачынаючы з 1928 году яны ня піялі разам, а па аднаму. Грушэўскі між іншым заявіў на камісіі, што:—„у сябе дома я піў, п'ю і буду піць".

Грушэўскі нават адмовіўся дапамагчы інцыятыўнай групе на арганізацыі таварыства ратаваньня на водзе і ня даў ім лодкі.

Калі т. Чэсакоў, будучы дэлегатам акрпартыйнае канфэрэнцыі, быў накіроўвае на працу на вучастак, дык партыйцы накінулі Грушэўскага не дапамагалі, а ягчэ перашкаджалі, кажучы:—„раней служба, а потым партыйныя справы".

А бюро ячэйкі КП(б), якое разглядала гэтае пытаньне, абмежавалася тым, што высунула пытаньне аб звальненьні з працы т. Гарына, а Бяламу запрапанавала толькі абвясьціць выгавар, а Грушэўскаму паставіла на від, а што скажа РСІ? Сафіян

Прымусовы ўклад.

Здавалася-б адразу, што гэта фэльетон, але гэта сапраўдная гісторыя. 19 кастрычніка 1928 г., выяжджаючы на сталую працу ў Гомель, я зьвярнуўся да начальніка пошты на станцыі Талька з пытаньнем.

— Ці магу я атрымаць свой уклад у Гомелі.

Мне адказваюць:

— Бяз усякага затрыманьня.

З такім адказам еду спакойна ў Гомель. 23 кастрычніка г. г., калі зьвярнуўся ў касу ашчаднасьці № 31 пры акрфа, каб атрымаць грошы, мне адказваюць другое. Выдаць грошы ня можам, трэба зрабіць пераводз. Ня хочацца спрачацца, прыводзіць словы начальніка пошты ст. Галька—бяджаюся зрабіць пераводз. Кладу ў кнігу забраў і ў той-жа дзень выдалі ў замен квіток і казалі прыйсьці праз тры дні. Прайшло ўжо сем дзён, а грошай няма.

Бачу зьявішча ненармальнае, зьвяртаюся ў РСІ і падрабязнова тлумачу гэтае пытаньне з надзеяй знайсьці дапамогу... аж-ас чую адказ.

— А мы тут прычым...(?!) добрая справа.

Пытаю зноў, як па вашаму—гэтае зьявішча нармальнае?

— Не.

А калі не, дык вы-ж павінны яе дапамагчы. Так адказу і не атрымаў.

А між тым час праходзіць, грошай няма ні капейкі, прыходзіцца мучацца і па чыёй віне—сам не ведаю. Патрабаваў-бы кніжку і паехаў-бы на стаўое месца, каб атрымаць грошы—дык я маю ні капейкі на білет.

Гомель. **Язэпка.**

Ахова працы, рацыяналізатары—дзе вы?

(Менскі Акр. Зям. Аддзел).

Дзе няма гаспадара, там няма парадку.

Ня дзіва, калі дзе-небудзь на пазанадворку валяецца куча сьмецьця, але зусім незразумела, калі яна ляжыць на Плацу Волі і ніхто яе не заўважае.

Гляньце ў чарцёжную Менскага АКРЗА. Вы будзеце спрачацца, што гэта не чарцёжная, а месца, дзе абурдошаны ўсе непатрэбныя рэчы.—Тут вы заўважыце старыя, паломаныя, бяз ножак крэслы, стары бляшаны кіпяцільнік, скрынкі, козлы, дошкі і шмат іншых рэчаў, якія ніяк ня могуць служыць абсталяваньнем, але міжвольна адыгрываюць ролю мабліроўкі чарцёжнай.

Сярод гэтай мабліроўкі ў пылу, у гразі «нерастуюць» каморнікі. І ніхто ня цікавіцца гэтым «нерастам». Як грачкі вясною вяюць за гнёзды, гэтак каморнікі вяюць за сталы. Сталоў у чарцёжнай куча (вось так і ляжаць у кучы!), а працаваць няма на чым. І няма гаспадара, які паклапаціўся-б падшукаць месца пад чарцёжную і паставіць сталы.

Ня думайце, што гэта выпадковасьць. Гэта штогодняя гісторыя. Штогодна АКРЗА склікае каморнікаў дзеля камэральнае працы, але ніводнага году ня было, каб АКРЗА падрыхтаваў чарцёжныя і ўтварыў спрыяючыя ўмовы дзеля працы.—Прыехаўшы ў АКРЗА, кожны каморнік павінен патраціць некалькі дзён на падшуканьне месца за сталом.

Далей. Насьпех падрыхтаваныя памяшканьні не адпавядаюць ні санітарным, ні гігіенічным умовам працы. Цесната. Няма вэнтылятараў, плявацельніц, вешалак. Дзе хто сядзіць, там каля яго і вопратка, і калёшы; у куткі плююць, у куткі кідаюць канчары папяросаў...

Цесна, дымна, брудна. І ніхто на наш сьмецьнік не заглядае—ні ахова працы, ні рацыяналізатары, ні «асенізатары».

А трэба было-б шмат «сьмецьця» вымесьці з нашага АКРЗА.

Рыгор Зуб.

Памяці прафэсара М. М. ГАЙДУКОВА.

БДУ панёс новую страту. Памёр прафэсар па катэдры батанікі М. М. Гайдукоў. Вучоны сусьветнага мантабу, М. М. Гайдукоў на працягу 5 год займаў катэдру батанікі ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце і паставіў яе на тую вышыню, на якой знаходзіцца катэдры ў іншых унівэрсытэтах. Вялікі энтузыяст навукі, М. М. Гайдукоў захопліваў сваім энтузыязмам сваіх вучняў, аддаючы апошнім свае навуковыя здольнасьці, свае веды. Надзелены вялікім дарам творчасьці, М. М. Гайдукоў зьдзіўляў усіх сваёю прастатою, надзвычайнаю скромнасьцю і даступнасьцю. Толькі тады, калі ішла справа аб навуцы і навуковых мэтадах, М. М. Гайдукоў станавіўся надзвычайна ўпартым, моцным, духоўна бадзёрым і з надзвычайным жарам адстайваў свае думкі.

На працягу навуковай дзейнасьці М. М. Гайдукову прышлося весьці барацьбу з Напалеонамі ў навуцы, як ён любіў выказвацца. Гэтыя Напалеоны затрымлівалі разьвіцьцё навуковай думкі і перашкаджалі разьвіцьцю навукі, не даючы магчымасьці высоўвацца маладым навуковым дзеячам, якія па сваіх поглядах ішлі іншымі шляхамі, у параўнаньні з Напалеонамі ў навуцы. Сам М. М. Гайдукоў, які з маладых гадоў ставіў сьмелыя вопыты, што ў сучасны момант апраўданы ўсёю навукаю, вынес нямала ганьбы з боку пэдантаў-бюракратаў навукі, пазбаўленых вялікага духу і навуковай творчасьці. Але М. М. Гайдукоў не здаваў сваіх пазіцый на навуковым фронце. Ён усё жыцьцё быў вялікім рэвалюцыянэрам-барацьбітом за навуковую праўду, і нішто не магло яго прымусіць адмовіцца ад той навуковай праўды, якая, на яго думцы, была ім дасягнена. З гэтага боку М. М. Гайдукоў сярод старой прафэсуры займаў асобнае месца—сваёю сьмеласьцю выступаць супроць прызнаных аліміпіядаў навукі, ня гледзячы на тое, што гэта яму перашкаджала доўгі час займаць вучоныя пасады ў розных вышэйшых навучальных установах. М. М. Гайдукоў ня мог мірыцца з навуковым абскурантызмам, з навуковаю схалястыкаю.

М. М. Гайдукоў быў ня толькі тэарэтык, але і вучоны практык. З пачатку заснаваньня Інстытуту Прыкладной Батанікі ён прымаў самы шчыры ўдзел у яго працы, аддаючы свае сілы новай навуцы, добра ведаючы, якое яна мае значэньне для народнай гаспадаркі нашага Саюзу наогул і Беларусі,—у прыватнасьці. І сваіх вучняў ён таксама накіроўваў па гэтаму шляху і цэлы шэраг пытаньняў былі пастаўлены ў яго лябараторыі і распрацаваны яго вучнямі, студэнтамі БДУ.

Спэцыялісты таварышы па яго працы ў унівэрсытэце і ў іншых установах у бліжэйшыя часы адзяць навукова-пэдагагічную працу М. М. Гайдукова, а сягоньня, калі цела нябожчыка Гайдукова знаходзіцца ў сваёй любімай лябараторыі, і студэнты, і прафэсары, і знаёмыя аддаюць яму апошні доўг, мы павінны скласьці сваю галаву перад целам вялікага вучонага, вялікага чалавека, прыяцеля студэнцкай моладзі, які з любоўю сачыў за посьпехамі нашай пралетарскай моладзі.

Сьветлая памяць вялікаму вучонаму і выдатнаму чалавеку!

Рэктар БДУ, праф. У. Пічэта.

СЛОВА ДАЕЦЦА ПРАКУРОРУ.

Зьмітро Рашэцька, гр-н вёскі Судавічы, на ўсім сваім жыцьці нават пры ўважлівым разглядзе ня мог убачыць ніводнай цёмнай плямы. Ды ня толькі ён сам,—нават блізкія суседзі і тыя ні ў чым не маглі ўлікнуць Зьмітра Рашэцьку. Як сярэдняк,—ён жыў сярэдня—спраўна плаціў падаткі, купляў у кааперацыі і прадаваў кааперацыі, а ў грамадзкім жыцьці, хаця і не пераганяў другіх, затое і не адставаў ад рэшты зьвядомай вёскі.

Наогул, Зьмітро Рашэцька ня меў на сваім сумленьні нічога адмоўнага. Вось чаму, калі Рашэцька атрымаў ад народнага суду 5 вучастку (м. Парычы) позву, дзе гаварылася, што ён «прыцягваецца да адказнасьці», то адразу рашыў: «тут памылка і зэльзь нічога».

І калі ў нядзелю раніцой З. Рашэцька адпраўляўся на суд, і яго жонка, правёўшы мужа за вароты, прыкрыла фартухом твар і спрабавала ўсхліпнуць, ён ле сурова застанавіў:

— Ня дуры, баба!

На суд Зьмітро Рашэцька ехаў вусім спакойны. І каб яму хто сказаў наперад, за што яго будуць судзіць і што яго засудзяць,—ён бы ніколі не паверыў.

А між тым, у судзе са Зьмітрам Рашэцькам здарылася набывалае і нячуванае... Але пачнем спачатку.

Вясной 25 году сяляне Ракшынскага сельсавету ўзялі ў Парыцкім с.-г. крэдытным таварыстве насенную пазыку: лубін, канюшыну, авёс. Абавязацельства на пазыку выдаў Ракшынкі сельсавет і падпісаў абавязацельства былы старшыня с.-с. Аляксей Рашэцька.

Увосень А. Рашэцьку прызвалі ў Чырвоную армію. Здаючы справы сельсавету новаму кіраўніцтву, Аляксей Рашэцька здаў у тым ліку і справы аб насенній пазыцы: сьпісы разьмеркаваньня пазыкі і расьпіскі грамадзян атрымаўшых яе і папярэдзіў сельсаветчыкаў:

— Прыдзе тэрмін—насенную пазыку сышчыце.

— Добра, сказалі на разьвітаньне сельсаветчыкі, сышчам, ня дзе яна дзенецца!

Можа-б і сышчалі новыя сельсаветчыкі насенную пазыку ад сялян Ракшынскага сельсавету, але здарылася неяк так, што яны яе да тэрміну нясышчалі: сяляне самі не варочалі пазыкі, а с.-г. таварыства не напамінала—усе забыліся.

Праз два гады ў Парыцкім с.-г. крэдытным т-ве агледзеліся, што за сялянамі Ракшынскага сельсавету лічыцца насенная пазыка і к таму-ж пратэрміновая.

— Ну, што? Трэба, мусіць, сышчаць,—рашыў старшыня таварыства.

— А ўжо-ж, ня шкодзіць—падтрымалі яго члены праўленьня.

І пачалі сышчаць. Але справа гэта ня лёгкая. Як сышчаць? З каго сышчаць, вось пытаньні, якія патрабавалі ўсебаковага абгаварэньня і з якімі праўленьне не магло справіцца. З сялян сышчаць пазыку?—неяк нялоўка: яны ўжо забыліся пра яе. На сельсавет націскаць? дык ізноў-жа—прычым ён тут: сельсаветчыкі-ж ня бралі пазыкі. А сышчаць трэба. Дык з каго.

Дэбаты па гэтаму пытаньню на спэцыяльным пасяджэньні праўленьня таварыства мелі даволі разнастайны ўхіл, але, нарэшце, большасьцю галасоў было вырашана: насенную пазыку і процанты па ёй за пратэрмінаваны час сышчаць са Зьмітры Рашэцькі, гр-на в. Судавічы.

— Чаму з Рашэцькі?—нясьмела спытаўся адзін з членаў праўленьня.

— Паперыце, адказалі яму—ён брат былога старшыні сельсавету Аляксея Рашэцькі, а падругое... наогул няхай заплаціць. Трэба-ж з каго-небудзь сышчаць?

На гэтым і парашылі. І справу аб пратэрмінаванай пазыцы, якую ўзялі сяляне Ракшынскага сельсавету, перадалі ў народны суд 5-га вучастку і адказчыкам па гэтай справе прыцягнулі Зьмітру Рашэцьку...

Вось чаго не чакаў Зьмітра Рашэцька! Вось чаму ён ніколі не паверыў-бы. І калі яму ў судзе сказалі аб гэтым, ён думаў, што над ім жартуюць, і сам пачаў жартаваць:

— што-ж, кажа, за ўсіх заплачу, у мяне капіталаў хопіць.

Але судзьдзя даволі падрабязна растлумачыў яму, што народны суд не жартуе, што народны суд наогул ня можа жартаваць і што Зьмітро Рашэцька запраўды прыцягваецца да адказнасьці за тое, што сяляне Ракшынскага сельсавету, узяўшы насенную пазыку, не зьвярнулі яе да тэрміну.

— Дык я-ж пазыкі ня браў,—паспрабаваў бараніцца Зьмітро Рашэцька, і нічога аб ёй ня ведаю, бо...

— Суд разьбярэ — перапыніў яго судзьдзя,—і вырашыць, як трэба.

І запраўды, народны суд 5-га вучастку справу аб насенній пазыцы вырашыў „справядліва".

— Хоць Зьмітро Рашэцька і серадняк,—разважалі судзьдзі,—але і насенную пазыку, і процанты па ёй ён ня здолее заплаціць, а вось адны процанты заплоціць.

На гэтым і пастанавілі.

— «Насенную пазыку Парыцкаму с.-г. таварыству павінен зьвярнуць той, хто яе браў, г. зн. сяляне Ракшынскага сельсавету, а процанты па ёй за пратэрмінаваны час—няхай заплаціць Зьмітро Рашэцька.

— Чаму гэта я?—зьдзівіўся З. Рашэцька, я-ж нічога ня ведаю...

— Ты ня ведаеш, дык суд ведае. Кончана!

Для народнага суду на гэтым фактычна і было „кончана", але для Зьмітры Рашэцькі—далёка ня кончана. Прав некаторы час на яго павялі атаку судовы выканаўца і міліцыя: апісваюць яго маемасьць для продажы, устанаўліваюць тэрміны ўплаты, адкладваюць гэтыя тэрміны, зноў націскаюць.

— Плаці! Хоць трэсьні, а плаці.

— З чаго-ж я заплачу,—просіцца Зьмітра Рашэцька,—і за вошта я плаціць мушу?

— Справа ня наша,—адказваюць яму выканаўцы,—у нас загад ёсьць.

Цяжка ўздыхае Зьмітра Рашэцька,—не чакаў ён такой несправядлівасьці,—галосіць жонка, плачуць дзеці. І ва ўсіх адно пытаньне: «За што?

І запраўды, за што раскідаюць гняздо селяніна Зьмітры Рашэцькі? Чаму ён павінен плаціць процанты за пратэрмінаваную пазыку, якую ўзялі сяляне Ракшынскага сельсавету? За чые грахі ён нясе кару?..

Толькі пракурор можа адказаць на гэтыя пытаньні. І дзеля гэтага слова даецца пракурору Бабруйскай акругі.

Лявон Вялецкі.

Да ўпарадкаваньня работы банкаў.

(У парадку абгаварэньня).

У БССР, як і па ўсяму СССР, крэдытная сетка ў мінулым разьвівалася стыхійна і побач з Дзяржбанкам адчыняліся спэцбанкі, якія імкнуліся арганізоўваць свае аддзяленьні і на перэферыі.

Але, ня гледзячы на гэта, у БССР галоўную ролю адыгрываў Дзяржбанк. Некалькі іншае становішча было ў Гомельскай губэрні, дзе ў моц цэлага шэрагу прычын першае месца заняў Раббанк—адзіны ў СССР інтэгральны банк.

Гэткае сваё значэньне Раббанк мог захаваць толькі на некаторы час. І, сапраўды, прынятыя ў 1927 годзе новыя прынцыпы пабудовы крэдытнай сеткі зусім адхілялі магчымасьць існаваньня гэткага банку. Гэта становішча прымусіла Раббанк зьмяніць сваю працу, тым больш, што, у зьвязку з далучэньнем да Беларусі, часткай зьменшыліся яго сродкі, перададзеныя Бранскаму Камунальнаму Банку.

Праведзенае ў 1927 годзе разьмежаваньне кліентуры яшчэ больш паглыбіла камунальны характар працы Банку, што выяўляецца са ўсёй яго працы за другую палову 1927-28 г. Праўда, у яго працы заўважаем яшчэ рэшткі ранейшых тэндэнцый у бок крэдытаваньня арганізацый, нічога супольнага з працай Раббанку ня маючых, і нават іншы раз тых, якія знаходзяцца па-за межамі БССР.

Зьмены ў пабудове актыўных апэрацый унесьлі адпаведную перагрупоўку і ў пабудове асноўнага капіталу і іншых пасываў.

У выніку мы сталі перад фактам наяўнасьці ў БССР 2-х камунальных банкаў (Раббанк і Белкамунбанк), чаму ў парадак дню і павінна быць пастаўлена пытаньне аб структуры сыстэмы камунальнага крэдыту ў БССР.

Па нашай думцы, сыстэма камунальнага крэдыту ў БССР павінна быць пабудавана па прынцыпу цэнтралізацыі, г. зн. павінен быць адзіны Белкамунбанк з аддзяленьнямі ў тых акруговых гарадох, дзе мясцовая гаспадарка атрымала шырокае разьвіцьцё і дзе ёсьць для гэтага эканамічныя прадпасылкі.

Такая пабудова сыстэмы робіць больш лёгкім і выгодным плянаваньне крэдыту.

Мы мяркуем, што ў умовах правядзеньня суровага рэжыму эканоміі ў выдатках дзеля вызваленьня вялікіх сродкаў на індустрыялізацыю краіны, пытаньне аб структуры сыстэмы павінна таксама ўлічваць і гэты момант. Утрыманьне-ж аддзяленьняў банку каштуе шмат таньней, чым самастойны банк. Гаворачы аб Раббанку, трэба адзначыць, што ўтрыманьне яго каштуе столькі, колькі і ўтрыманьне Белкамунбанку (каля 70.000 руб.) у той час, як утрыманьне аддзяленьня каштуе максымум 25—30 тысяч руб.

Гэтыя моманты, а таксама і шэраг іншых, якія немагчыма падаць у невялікай газэтнай заметцы, робяць нас прыхільнікамі ператварэньня Раббанку ў аддзяленьне Камунальнага Банку.

Біргер.

ПОПЕЛ—НА СЯЛЯНСКІЯ ПАЛЕТКІ.

НАМ ПАТРЭБНА КАЛІЙНАЕ УГНАЕНЬНЕ.

Для павялічэньня ўраджайнасьці нашых палёў і ўгнаеньня асушанага балота нам патрэбна калійнае ўгнаеньне, якога ў нас не хапае. Пляны завозу штучнага ўгнаеньня скарачаюцца з прычыны яго недастачы. Калійнай, напрыклад, солі мы свайё ня мелі і змушаны былі ўвозіць яе з-заграніцы.

У нас адкрыты залежы калійнай солі. Будуюцца вялікія заводы для перапрацоўкі калійных угнаеньняў. Але гэтыя заводы дадуць нам сваю соль толькі праз год-два. А пакуль-што наша зямля патрабуе ўгнаеньня, каб даваць добрыя ўраджаі.

Тут нам на дапамогу можа прысьці попел, у якім шмат калія. Асабліва каштоўны попел з бярозавых дроў. Кожная сялянская гаспадарка можа сабраць за зіму каля 15 пудоў попелу. Да гэтага часу мы мала гаварылі аб скарыстаньні попелу, і ў Беларусі выкідалася штогод каля 12 міліёнаў пудоў попелу. Гэта страшэнная нядбайнасьць і яе неабходна зьнішчыць. Трэба забясьпечыць сялянскія палі дармовым угнаеньнем. Трэба ўзьняць ураджайнасьць гэтых палёў.

Нам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на збор попелу ў гарадох: на фабрыках і заводах, у вайсковых казармах, у дзяржаўных і прыватных дамох. Адзін Менск можа сабраць за год каля 500 тысяч пудоў дармовага ўгнаеньня—попелу. Гэтым попелам можна ўгнаіць 20 тысяч дзесяцін зямлі, гэта значыць каля чацьвертай часткі ўсёй пасяўной плошчы Меншчыны. Калі-ж сюды дадаць той попел, што могуць сабраць земляробы, дык мы зможам больш чым на 50 процантаў забясьпечыць нашы палеткі калійным угнаеньнем.

ХТО ПАВІНЕН ЗЬБІРАЦЬ ПОПЕЛ.

Зьбіраць попел павінны ўсе прадпрыёмствы і ўстановы, якія карыстаюцца драўняным апалам. Жыльлёвая кааперацыя таксама можа тут нам дапамагчы. Каб наладзіць збор попелу ў прыватных дамох, гарсавету трэба выдаць аб гэтым належную пастанову.

Пытаньне з захаваньнем і падвозкай попелу ў адно месца таксама важнае, і яго трэба безадкладна вырашыць. Неабходна знайсьці склады для захаваньня попелу. З гэтых складаў попел будзе пасьля адпраўляцца на вёскі. Вывазка попелу з Менску—справа саміх гаспадароў.

Што-ж датычыць нашых буйнейшых заводаў, дык тут справу збору попелу можна арганізаваць такім парадкам,—што ўвесь сабраны попел зьбіраецца з прадпрыёмства ў адно месца. Попел з прадпрыёмстваў не патрэбна вазіць куды-небудзь у адно месца ў горадзе. У кожнага прадпрыёмства і арганізацыі ёсьць свае падпэфныя вёскі, якім яны могуць непасрэдна і аддаваць сабраны попел.

Каб гаспадары ведалі, як зьбіраць і захоўваць попел, а таксама яго скарыстоўваць, неабходна выдаць лістоўку, у якой неабходна растлумачыць прасьцейшыя спосабы збору і скарыстаньня попелу.

ПОПЕЛ—КАШТОЎНАЕ УГНАЕНЬНЕ.

З практыкі горацкай дасьледчай станцыі відаць, што пуд попелу дае павялічэньне ўраджаю жыта на 15 фунтаў.

Барысаўская дасьледчая станцыя значна павялічыла попелам ураджай бульбы. На Энгельгардзеўскай дасьледчай станцыі, дзе клалі на дзесяціну сенажаці па 90 пудоў попелу, зьбіралі больш ад 32 да 90 пудоў сена. Гэтыя досьледы кажуць за тое, што попел, які да гэтага часу выкідаўся за плот, выгадна высяваць, як угнаеньне.

Калі-ж перавесьці каштоўнасьць попелу, як угнаеньня, на грош

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулу 65 Вэтэрынарнага Статуту БССР.

На падставе пастановы СНК СССР ад 7 жніўня 1928 году „Пра парадак перавозкі па чыгуначных і водных шляхох хатніх жывёлы і сырых жывёлавых прадуктаў" Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць артыкул 65 Вэтэрынарнага Статуту БССР у наступнай рэдакцыі:

„65. Парадак і ўмовы перавозкі па чыгуначных, грунтавых і водных шляхох буйнае і дробнае рагатае жывёлы, вярблюдаў, аленяў, коняй, маладняка, жывых хатніх птушак і сырых жывёлавых прадуктаў вызначаецца нормамі, якія выдаюцца цэнтральным камітэтам па перавозках на ўзгадненьні з Камітэтам па Вэтэрынарных Справах пры Савеце Працы і Абароны.

Гэты парадак не пашыраецца на перавозкі коняй і вярблюдаў Народным Камісарыятам па Вайсковых і Марскіх Справах. Такія перавозкі рэгулююцца „Палажэньнем пра перавозку войск і вайсковых грузаў".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А Хацкевіч.

17 лістапада 1928 году
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР.

об изменении статьи 65 Ветеринарного Устава БССР.

На основании постановления СНК СССР от 7 августа 1928 г. «О порядке перевозки по железнодорожным и водным путям домашних животных и сырых животных продуктов» Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изложить статью 65 Ветеринарного Устава БССР в следующей редакции:

„65. Порядок и условия перевозки по железнодорожным, грунтовым и водным путям сообщения крупного и мелкого рогатого скота, верблюдов, оленей, лошадей, молодняка, живых домашних птиц и сырых животных продуктов определяется нормами устанавливаемыми Центральным Комитетом по перевозкам по согласовании с Комитетом по Ветеринарным Делам при Совете Труда и Обороны.

Настоящий порядок не распространяется на перевозки лошадей и верблюдов Народным Комиссариатом по Военным и Морским делам. Такие перевозки регулируются „Положением о перевозке войск и военных грузов».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

17 ноября 1928 года
г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулаў 4 і 5 пастановы ЦВК і СНК БССР «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць артыкулы 4 і 5 пастановы ЦВК і СНК БССР за 19 лютага 1927 г. «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках» (З. З. БССР 1927 г., № 12, арт. 42) у наступнай рэдакцыі:

„4. Аддзел (часьць) камунальнай гаспадаркі правярае гэтыя падставы і не пазьней трох дзён пасьля атрыманьня заявы пастанаўляе аб высяленьні. Копія пастановы безадкладна даецца пад расьпіску асобе, якая высяляецца; пры гэтым даецца сямідзённы тэрмін для добраахвотнага высяленьня.

Скаргі на пастановы аддзелаў (часьцей) камунальнай гаспадаркі пра высяленьне могуць падавацца запікаўленымі асобамі не пазьней пяці дзён ад дня атрыманьня копіі пастановы аб высяленьні ў вышэйшы над даным камунальным органам выканаўчы камітэт альбо гарадзкі савет, а таксама пракурорскаму нагляду, якія маюць права прыпыняць высяленьне да разгляду скаргі.

5. Пасьля сканчэньня сямідзённага тэрміну для добраахвотнага высяленьня (арт. 4) альбо пасьля канчатковага вырашэньня скаргі, калі высяленьне было прыпынена, аддзел (часьць) камунальнай гаспадаркі даручае адпаведнаму органу міліцыі безадкладна выканаць пастанову пра высяленьне".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

17 лістапада 1928 году.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении статей 4 и 5 постановления ЦИК и СНК БССР «Об условиях и порядке выселения граждан из занимаемых ими помещений в городах и местечках».

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изложить статьи 4 и 5 постановления ЦИК и СНК БССР от 19 февраля 1927 года «Об условиях и порядке выселения граждан из занимаемых ими помещений в городах и местечках» (С. З. БССР 1927 г., № 12. ст. 42) в следующей редакции:

„4. Отдел (часть) коммунального хозяйства проверяет эти основания и не позже трех дней по получении заявления выносит постановление о выселении. Копия постановления немедленно вручается под расписку выселяемому; при этом предоставляется семидневный срок для добровольного выселения.

Жалобы на постановления отделов (частей) коммунального хозяйства о выселении могут подаваться заинтересованными лицами не позже пяти дней со дня получения копии постановления о выселении в высший над данным коммунальным органом исполнительный комитет или городской совет, а также прокурорскому надзору, которые имеют право приостанавливать выселение до рассмотрения жалобы.

5. По истечении семидневного срока для добровольного выселения (статья 4) или после окончательного разрешения жалобы, если выселение было приостановлено, отдел (часть) коммунального хозяйства поручает соответствующему органу милиции немедленно выполнить постановление о выселении».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

17 ноября 1928 г.
г. Минск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену складу Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зьняць з т. т. Міненькага, Марка Ільліча, Кострыца, Міхаіла Іванавіча, Сакаленка, Аляксандра Аронавіча, Зайдэнберга, Саламона Наумавіча, Гурэвіча, Нахмана Гіршава і Каўшэўнага, Фёдара Рыгоравіча, абавязкі членаў Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

2. Назначыць т. т. Сасноўскага, Антона Міхайлавіча, Царонка, Аляксандра Рыгоравіча, Міловскага, Аляксандра Ільліча, Шоўкава, Івана Сергеевіча, Блюмкіна, Мойсея Львовіча, Любамірскага, Хэніна Саламонавіча, Іванова, Івана Аляксандравіча, членамі Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

21 лістапада 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении состава Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Освободить т. т. Миненького, Марка Ильича, Кострица, Михаила Ивановича, Соколенко, Александра Аронавича, Зайденберга, Соломона Наумовича, Гуревича, Нахмана Гиршева и Ковшевного, Федора Григорьевича, от обязанностей членов Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

2. Назначить т. т. Сосновского, Антона Михайловича, Царонка, Александра Григорьевича, Миловского, Александра Ильича, Шелкова, Ивана Сергеевича, Блюмкина, Мойсея Львовича, Любомирского, Ханина Соломоновича, и Иванова, Ивана Александровича, членами Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

21 ноября 1928 года
г. Минск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра ўзмацненьне загатоўкі лому чорных металяў.

У дапаўненьне да пастановы Эканамічнай Нарады за 27 кастрычніка 1928 г. пра збор і рэалізацыю лому чорных металяў («Савецкая Беларусь» за 28 X--1928 г., № 250) Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў пастанаўляе:

1. У мэтах узмацненьня загатоўкі металёвага лому арганізаваць пры Эканамічнай Нарадзе Камісію ў складзе: Намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР т. Стракоўскага, Намесьніка Народнага Камісара Гандлю т. Абрамсона і Кіраўніка Заходняй Абласной Канторы Усесаюзнага Металюргічнага Сындыкату т. Ташлыка, пад старшынствам т. Стракоўскага.

2. Усе прадпрыёмствы і ўстановы БССР абавязваны выконваць усе указаньні Камісіі па пытаньнях, якія датычацца збору лому, а таксама па першаму запатрабаваньню Камісіі прадстаўляць ёй матэрыялы як аб наяўнасьці, так і аб ходзе загатоўкі, здачы і адгрузкі лому.

3. Даручыць Камісіі ў месячны тэрмін падаць у Эканамічную Нараду даклад аб ходзе загатоўкі лому і перспектывах далейшай яе працы.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры СНК БССР М. Карклін.

Сакратар Эканамічнае Нарады БССР В. Крывіцкі.

15 лістапада
1928 г. г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

об усилении заготовки лома черных металлов.

В дополнение к постановлению Экономического Совещания от 27 октября 1928 г. о сборе и реализации лома черных металлов «(Савецкая Беларусь» за 28-X-1928 г. № 250) Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров постановляет:

1) В целях усиления заготовки лома металлов организовать при Экономическом Совещании Комиссию в составе: Заместителя Председателя Высшего Совета Народного Хозяйства БССР т. Строковского, Заместителя Народного Комиссара Торговли т. Абрамсона и Управляющего Областною Конторою Всесоюзного Металлургического Синдиката т. Ташлыка, под председательством т. Строковского.

2) Все предприятия и учреждения БССР обязаны исполнять все указания Комиссии по вопросам, касающимся сбора лома, а также по первому требованию Комиссии представлять ей материалы как о наличности, так и о ходе заготовки, сдачи и отгрузки лома.

3) Поручить Комиссии в месячный срок представить в Экономическое Совещание доклад о ходе заготовки лому и перспективах дальнейшей ее работы.

Председатель Экономического Совещания БССР М. Карклин.

Секретарь Экономического Совещания БССР В. Кривицкий.

15 ноября 1928 г.
г. Минск.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ БЕЛАРУСКАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ ПРАЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

28 лістапада мінула 5 год з дня арганізацыі аб'яднаньня пралетарскіх пісьменьнікаў «Маладняк». Гэту вялікую ўрачыстасьць адзначыў зьезд «БелАПП» урачыстым пасяджэньнем у клюбе імя К. Маркса.

Сярод гасьцей, запрошаных на ўрачыстасьць прысутнічалі старыя пісьменьнікі Я. Купала і Я. Колас. Былі прадстаўнікі літаратурных аб'яднаньняў «Полымя» і „Узвышша".

Урачыстае пасяджэньне зьезду адчыніў старшыня «Маладняка» тав. Галавач.

Зьезд БелАПП віталі прадстаўнікі: ад украінскага аб'яднаньня пісьменьнікаў тав. Кузьміч, ад Закаўкаскае арганізацыі пралетарскіх пісьменьнікаў тав. Сулава, ад Літоўскай сэкцыі «Маладняка» тав. Матулайціс. Апрача таго, юбіляра вітаў вядомы гісторык і крытык беларускай літаратуры М. І. Гарэцкі.

— За 5 год упартай працы,—кажа тав. Гарэцкі,—„Маладняк" зрабіў вялікую справу. 5 год гэта вельмі малы для гісторыі час, аднак, за гэты кароткі тэрмін „Маладняк" даў беларускай культуры тое, што называецца пралетарская літаратура.

У працы „Маладняка" ёсьць шмат дасягненьняў, але нельга сказаць, што няма хібаў. Недахваты ёсьць, у працягу далейшай працы БелАПП гэтыя недахваты зьнішчыць, бо яго шэрагі ня толькі папаўняюцца новымі сіламі, але і старыя сілы набываюць вопыт і практыку ў тварэньні пралетарскай літаратуры.

Прадстаўнік «ВОАПП» тав. Сутырын, вітаючы юбіляра, зазначыў:

— Я ўжо гаварыў аб тых вялізарных здабычах, якія мае «Маладняк» за 5 год свае працы не адзін раз. Думаю, што паўтарацца ня варта. Нехай мне даруюць таварышы маладнякоўцы за тое, што я хачу троха пакрытыкаваць іх.

Тав. Сутырын спыніўся на тым, што „Маладняк" крыху запозна паставіў пытаньне аб шчыльным згуртаваньні пралетарскіх пісьменьнікаў усіх нацыянальнасьцей Беларусі.

Вітаў «Маладняк» з 5-цігодзьдзем праф. Бузук. Ён выказаў жаданьне ўвайсьці ў «БелАПП». Зьезд аднагодна зацьвердзіў праф. Бузука сябром «БелАПП'у».

Прывітальная тэлеграма рэктара Камуністычнага Ўнівэрсытэту, крытыка і публіцыста тав. Сяньковіча канчаецца сказам:

— Буду лічыць за гонар, калі зьезд «БелАПП'у» абмяркуе пытаньне аб прыёме мяне ў шэрагі пралетарскіх пісьменьнікаў...

Бурныя воплескі гаворяць за тое, што тав. Сяньковіч аднагодна прымаецца членам «БелАПП'у».

Адказны слова на прывітаньні сказаў тав. Галавач.

Пальля ўрачыстай часткі, сіламі „Нашага тэатру" была наладжана мастацкая частка.

Першая спроба інсцэніраваньня паэмы Чарота «Босыя на вогнішчы" даволі ўдалая. Маладыя артысты іграюць „босых" з вялікім захапленьнем. Аднак, псуецца ўражаньне таксама тым, што артысты яшчэ маладыя і ня могуць добра справіцца з асноўным, што патрэбна для такой пастаноўкі—з мімікай. Глыбохія мэлёдраматычныя моманты некаторымі артыстымі (у сэнсе мімікі) перадаюцца вельмі слаба, што ў значнай меры зьмяншае эфэкт ад пастаноўкі.

Наогул-жа „Наш тэатр» паказаў добры прыклад. Трэба, каб артыстычны калектыў, які мае больш тэхнічных магчымасьцяў, узяўся за справу пастаноўкі на сцэне „Босых на вогнішчы».

А.

ХРОНІКА.

Вучоныя Беларусі абураны выступленьнем Жабялёва і Яфрэмава.

Азнаёміўшыся з агалошанымі ў друку весткамі аб супроцьсавецкіх выступленьнях у замежным друку члена Украінскай Акадэміі Навук Яфрэмава і члена Ўсесаюзнай Акадэміі Навук Жабялёва, ЦП сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларусі выказвае глыбокае абурэньне з прычыны гэтых выступленьняў.

ЦБ Беларускай сэкцыі вітае Ленінградзкую сэкцыю навуковых працаўнікоў, якая зганьбіла ўчынак акадэміка Жабялёва і выключыла яго з свайго складу. ЦБ спадзяецца, што ўчынак акадэміка Яфрэмава таксама знойдзе адпаведную ацэнку з боку украінскай сэкцыі навуковых працаўнікоў.

У прэзыдыуме Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі.

Сродкі на палепшаньне становішча майстэрняў.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі быў заслуханы даклад аб становішчы Інстытуту Сацыяльнага перавыхаваньня.

Прэзыдыум пастанавіў адпусьціць на палепшаньне становішча майстэрняў інстытуту абмундыраваньне для выхаванцаў і на інш. патрэбы каля 8000 руб.

Праца Гомельскага т-ва „Прыхільнік дзяцей".

На гэтым-жа пасяджэньні быў заслуханы даклад аб дзейнасьці Гомельскага т-ва „Прыхільнік дзяцей". Зараз на сродкі т-ва ўтрымліваюцца 4 майстэрні, дзе працуюць 240 бяспрытульных дзяцей, клюб-сталоўка і прыёмнік на 50 бяспрытульных дзяцей. Усяго, на бягучы год т-ва мяркуе выдаць на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю 167.000 руб. Для ўзмацненьня працы т-ва, прэзыдыум пастанавіў выдаць дапамогу ў суме 10.000 руб.

Нарада па пытаньню аб барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

27-га лістапада пры Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі адбылася нарада па пытаньню аб выкананьні пастаноў ЦК КП(б)Б аб барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю. З дакладаў ведамасьцьвенных органаў (Нарканьземляробства, Белсельсаюз, Нар. Кам. Працы, ЦК сялянскай узаемадапамогі) і г. д. высьветлілася, што пошукі паста нова выконваецца слаба. Да гэтага часу ня складзены канкрэтныя пляны па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

У сувязі з гэтым, на нарадзе было пастаноўлена даручыць ведамасьцьвенным органам у 2-хтыдневы тэрмін скласьці канкрэтныя пляны па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю, пасьля чаго прадставіць іх на разгляд у прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі.

Першая беларуская опэра.

Да часу сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР Белдзяржмузтэхнікум рыхтуе першую беларускую опэру «Тарас на парнасе». Музыку да гэтай апэры напісаў кампазытар Аладаў, лібрэту напісаў Ю. Дрэйзін.

Опэра будзе пастаўлена ў Белдзяржтэатры. Апрача гэтага ў дні сьвяткаваньня адбудзецца вялікі сымфанічны канцэрт, у які ўвойдуць шмат новых беларускіх музыкальных твораў.

Зімовыя перапынкі ў школах.

Згодна пастановы Нар. Кам. Асьветы БССР, зімовыя перапынкі на агульнаадукацыйных курсах, у 9-цігодках, гарадзкіх і мястачковых сямігодках і 4-хгодках і школах 1-й ступені, а таксама ў школах сялянскай моладзі, у школах фабрычна-заводзкага вучнёўства, у практыкавальных майстэрнях, у вячэрніх школах навучаньня тыпу, у вячэрніх школах рабочай і сялянскай моладзі, у школах для малапісьменных і па лікпунктах (гарадзкіх і мястачковых) адбудуцца з 1 па 15 студзеня ўключна.

Што тычыцца школьных устаноў павітасьветы (вячэрнія школы сялянскай моладзі, школы для малапісьменных, лікпункты) сельскіх мясцовасьцей, дык там зімовага перапынку ня будзе.

У школах 1 ступені і 4-хгадовых школах сельскіх мясцовасьцей зімовыя перапынкі вызначаны з 1-га па 7-га студзеня.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-цігадовага юбілею жанаддзелаў.

Камісія па правядзеньню сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя існаваньня жанаддзелаў наладжвае заўтра 1-га сьнежня ўрачыстае пасяджэньне ў Дзяржтэатры, прысьвечанае юбілею. Па ўрачыстым пасяджэньні адбудзецца даклад «10 год працы партыі сярод работніц і сялянак».

Пасьля ўрачыстай часткі адбудзецца пастаноўка БДТ-1.

Фінансаваньне будаўніцтва прамысловасьці ВСНГБ.

Тав. Карп, які гэтымі днямі езьдзіў у Маскву, паведаміў прэзыдыум ВСНГБ аб тым, што СНК СССР зацьвердзіў агульную суму фінансаваньня будаўніцтва прамыслов сьці ВСНГБ у 1928-29 годзе ў 12.860.000 руб.

Перарэгістрацыя пайшчыкаў МЦРК.

Праўленьне Менскага Цэрабкону пастанавіла распачаць з 1-га студзеня перарэгістрацыю ўсіх пайшчыкаў МЦРК.

Пасьля перарэгістрацыі пайшчыкам будуць выданы новыя клапэрацыйныя кніжкі.

Культурная сувязь з-за межамі.

Гэтымі днямі Беларуская Дзяржаўная бібліятэка атрымала па кнігаабмену буйную партыю кніг (звыш 1.000 шт.). З гэтай колькасьці атрыманы каля 500 кніг ад бібліятэкі Кангресу ў Вашынгтоне (Амерыка).

Апрача гэтага атрыманы каштоўныя кнігі ад нямецкага аб'яднаньня навуковых устаноў, ад Лянінскай Акадэміі, Брэслаўскага Унівэрсытэту (Чэха-Славакія) і ад чэскай Акадэміі.

На дапамогу школе.

ВСНГБ сумесна з Нар. Кам. Асьветы зьвярнуліся да ўсіх дырэктароў фабрык, заводаў і трэстаў, каб апошнія прынялі актыўны ўдзел у правядзеньні усебеларускага камсамольскага суботніка дапамогі школе.

Запрапанавана ў час суботніка выпускаць інструманты і абсталяваньне для арганізацыі майстэрняў пры школах, якія абслугоўваюць дзяцей рабочых гэтых прадпрыёмстваў.

На барацьбу з беспрацоўем.

Нар. Кам. Працы БССР зацьвердзіў план пашырэньня і арганізацыі новых працалектываў на бягучы 1928-29 гаспадарчы год.

Усяго на пашырэньне існуючых і арганізацыю новых працалектываў мясцовым акруговым кіраўніцтву працалектываў адпускаецца 375.000 руб.

Згодна зацьвярджанага плану, у бягучым гаспадарчым годзе пашырыцца працалектыў цацачнікаў, у якім будзе прынята 600 новых беспрацоўных.

Такім чынам пасьля пашырэньня ў гэтым працалектыве будуць працаваць да 1.000 чал.

Пашыраюцца таксама існуючыя працалектывы тэкстыльшчыкаў—мясцкі на 100 чал. і барысоўскі на 50 чал.

Апрача гэтага пашыраецца працалектыў «Утылізацыя» на 100 чал. Усяго ў гэтым працалектыве пасьля пашырэньня знойдуць сабе працу да 250 беспрацоўных рабочых і работніц.

Апрача пашырэньня старых працалектываў, Менскае акруговае кіраўніцтва адчыніць у бягучым годзе новы працалектыў шэйнікаў, пашырэньне менскага працалектыву тэкстыльшчыкаў на 50 чал. і пуск новай фабрыкі па выпрадоўцы цацак.

Да прыезду пісьменьніка А. Рэйзіна.

Гэтымі днямі адбылося пры Нар. Кам. Асьветы першае пасяджэньне для выпрацоўкі пляну па сустрэчы вядомага яўрэйскага пісьменьніка Абрама Рэйзіна, які прыяжджае ў Менск з Амэрыкі 10-га сьнежня. Камісія пастанавіла арганізаваць пісьменьніку ўрачыстую сустрэчу на вакзале з удзелам рабочых арганізацый і культурных устаноў. У час яго прыезду будуць наладжаны шэраг вечароў у Менску, а таксама ў Гомелі, Віцебску і г. д. Пастаноўлена ўва ўсіх менскіх газэтах надрукаваць біяграфію пісьменьніка. Апрача гэтага даручана пісьменьніку Зьм. Бядулі пераклясьці некалькі апавяданьняў пісьменьніка на беларускую мову. Адна з яўрэйскіх школ Менску і койданаўская яўрэйская школа (Рэйзін нарадзіўся ў Койданаве), будуць названы яго імем.

Камісія пастанавіла прасіць Нар Кам. Асьветы выпусьціць поўны збор твораў Рэйзіна.

Удзел студэнцтва ў перавыбарах саветаў.

ЦВ пралетэтуру распачало рыхтавацца да надыходзячых перавыбараў саветаў. Усім студэнцкім арганізацыям БССР запрапанавана паставіць на агульных сходах даклады аб задачах студэнцтва ў сувязі з перавыбарамі саветаў. Прыдаючы вялізарнае значэньне справе пасьпяховага правядзеньня перавыбараў, ЦВ пралетэтуру лічыць, што студэнты, якія разьяжджаюцца на зімовыя вакацыі, павінны прыняць у іх самы актыўны ўдзел. З мэтай сканцэнтраваньня ўвагі студэнцтва выключна на гэтай працы пастаноўлена ніякіх іншых грамадзкіх даручэньняў студэнцтву на час зімовых вакацый не даваць.

Удзел працоўных жанчын у конкурсе на лепшую працу сельсаветаў.

Прэзыдыум ЦВК БССР праводзіць з 1-га сьнежня г. г. па красавік 1929 г. конкурс на лепшую працу сэкцыі гарсавету і працу сельсаветаў. У сувязі з гэтым менскі акруговы жанаддзел самфанізаваў месцам прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні конкурсу.

Дзеля гэтага запрапанавана на буйных прадпрыёмствах правесьці нарады актывістак-сяброў саветаў, на якіх прапрацаваць пляны іх удзелу ў конкурсе на вёсцы, таксама запрапанова правесьці нарады актывістак-грамадзкіх працаўніц сельсаветаў.

Паляпшэньне прамысловай статыстыкі.

Прэзыдыум ВСНГБ даручыў трэстам неадкладна прыняць меры да паляпшэньня падачы з прадпрыёмстваў статыстычных вестак.

На тых прадпрыёмствах, дзе працуе 300 рабочых, дазволена прыняць на працу спэцыяльных статыстыкаў. На ўсіх іншых прадпрыёмствах статыстычная праца павінна быць даручана рахункаводам, якія і будуць адказваць за якасьць статыстычных вестак.

Новы намесьнік дырэктара Белдзяржкіно.

Былы дырэктар дзяржаўнага яўрэйскага тэатру тав. Матусаў назначан намесьнікам дырэктара Беларускага фото-кінотрэсту (Белгоскіно).

СУД.

ЗА БАНДЫТЫЗМ—НА РАСТРЭЛ.

Па пакіраваньню з сабою згвалтаваньня чыну Саракапудзенскага с.-с. Горацкага райёну Салаўёў Хведар з вядомымі злачынцамі—Сьцяпановым Агеем і з солянінам вёскі Хадароўкі Каменскага с.-с., Жалязоўскім Сьцяпанам, узброіўшыся адрэзамі, ноччу з 9 на 10 ліпеня 28 г. паймалі на хут. гр. Папова і, падышоўшы да хаты, зрабілі некалькі стрэлаў, а потым Жалязоўскі праз адчыненае акно, пад пагрозай запаліць хату, прапанаваў жонцы Папова запаліць сьвятло і, калі апошняя адмовілася, бандыт Жалязоўскі выстраліў у яе, але бяз вынікаў, бо было цёмна ў хаце.

Гр-н Папоў Васіль, выбегшы з хаты, пачаў склікаць бліжэйшых гр-н. Пры набліжэньні гр-н рабаўнікі адкрылі стрэльбу і забралі збожжа, вопратку, прадукты і ўпяклі.

Крымшэшук рабаўнікаў затрымаў і яны былі апазнаны пакрыўджанымі.

Пры затрыманьні і знаходжаньні пад вартай пры міліцыі, яны таксама абабралі там гр-на Краеўскага, у якога выцягнулі з кішэні 100 руб.

Калі бандытаў перавялі ў спраўдом, дык яны зрабілі набег, але былі затрыманы, ня выключэньнем Сьцяпанова.

Арэшскі акрэсд прыгаварыў Жалязоўскага і Салаўёва да вышэйшай кары—расстрэлу.

Вожык.

Апавяшчэньне.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У суботу 1 сьнежня а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход выкладчыкаў ГРАМАДАЗНАЎСТВА.

Яўка абавязкова.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы

Як рыхтуецца Менская акруга.

У вясеньнюю сяўбу 1929 г. мяркуецца павялічыць плян пад яравымі культурамі з 361.556 гэкт. у 1928 г. да 370.900 гэкт., што дае рост на 25 проц.

Значная праца прадугледжваецца на арганізацыі розных с.-г. каапэрацыйных аб'яднаньняў; мае быць арганізавана 59 калгасаў, 65 машынных т-ваў; 2 садаводна-гародныя гаспадаркі, 22 малочна-сыраварныя арцелі, 9 кантрольных саюзаў, 15 птушкаводных і 51 пасялковае т-ва.

Вялікая ўвага да вясеньняй сяўбы зварачваецца на ачыстку насеньня. Праца гэта мае быць праведзена своечасова, да пачатку сяўбы. Да гэтай кампаніі будуць прыцягнуты ўсе зернаачышчальныя машыны акругі.

Апроч машын, якія ўжо знаходзяцца на пунктах, мае быць закуплена розных насеннаачыстных машын—на 7584 руб. Усяго будзе ачышчана 17.000 тон рознага яравога насеньня, што складае каля 48 проц. усяго насеньня.

Адначасова з гэтым падрыхтоўваюцца мерапрыёмствы па пратручваньню насеньня аўса, ячменю і пшаніцы-ярушкі ад сажы. У вясеньнюю пасяўную кампанію мае быць пратручана да 1000 тон насеньня.

Паважнае месца ў надыходзячай вясеньняй сяўбе будзе займаць кантрактацыя розных культур.

У часе вясеньняй сяўбы мае быць пераведзена на шматпольле 21.750 гэктараў.

Упяршыню ў часе вясеньняй сяўбы 1929 г. будуць закладвацца штучныя выганы пад пашу. Усяго будзе закладзена каля 55 такіх паказальных выганаў. Выдаткі на закладку выганаў будуць адпускацца са сродкаў саміх арганізацый: саўгасаў, калгасаў, мэліярацыйных т-ваў. На арганізацыю штучных выганаў у пасёлках будуць даваць сродкі РВК.

Падрыхтоўка к-таў узаемадапамогі.

ЦК к-таў сялянскае ўзаемадапамогі даў дырэктыву ўсім раённым і сельскім к-там узаемадапамогі загатовіць да вясеньняй сяўбы 550 тысяч пуд. яравога насеньня. Таксама дадзена дырэктыва папоўніць с.-г. машын. існучыя пракатныя пункты і арганізаваць 43 новыя пункты. Кожны пракатны пункт павінен мець: машыну па зрэзцы куп'я, лугавыя бароны, лугавыя плугі і інш.

Пастаноўлена, як галавая задача, каб 300 насеннаачыстных машын на пракатных пунктах к-таў узаемадапамогі ачысьцілі 1.450 тысяч пуд. насеньня. Апрача гэтага, павінна быць арганізавана 20 прыпускных пунктаў, 1350 розных каапэрацыйных аб'яднаньняў, уцягнута ў каапэрацыю 10.000 бядняцкіх гаспадарак.

У часе вясеньняй сяўбы мяркуецца выкаць у выглядзе пазык па 6—8 пуд. насеньня 30.000 бядняцкім гаспадаркам, дапамагчы гужавой сілай 30.000 бядняцкім гаспадаркам, дапамагчы розным інвэнтаром 1620 гаспадаркам, грамадзкімі сіламі абслужыць 755 гэкт. камітэцкай зямлі.

Каго трэба прымаць у дашкольныя ўстановы.

У працы дашкольных дзіцячых устаноў у сучасны момант мы сустракаем адзін даволі значны недахват, дзякуючы якому бывае шмат вялікіх непаразуменьняў.

Да 1926 году сярод бацькоў было мала ахвотнікаў аддаваць сваіх дзяцей у дашкольныя ўстановы. Працу нашых дашкольных устаноў тады трэба было папулярызаваць і, каб мець посьпех—папулярызаваць умела. У апошнія годы дашкольныя ўстановы папулярызацыі свае працы зусім не патрабуюць.

Найлепшай агітацыяй за справу дашкольнага выхаваньня дзяцей ёсьць само выхаваньне іх.

Бацькі пераканаліся, што і для дзяцей і для бацькоў найлепшы выхад са становішча — дашкольная ўстанова.

Але тут мы сустреліся з новым, зусім нечаканым становішчам—з вялікім наплывам дзяцей у дашкольныя ўстановы.

У сучасны момант, калі няма магчымасьці дастаткова пашырыць дзіцячыя сады і дамы, і калі наплыў дзяцей вельмі вялікі, мы перажываем перыяд «боек» за дашкольныя ўстановы.

Паўстае пытаньне: каго задавальняць у першую чаргу? Зразумела, у першую чаргу павінны задавальняцца найгорш забясьпечаныя групы працоўных.

Аднак, кіраўніцтвы дашкольных устаноў паступаюць так ня ўсе. Наадварот, некаторыя нават разумеюць справу так.

— Дзіця рабочага,—кажуць,—ня прымем, бо трэба прыняць дзіця адказнага савецкага ці прафэсыянальнага дзеяча.

Такая пастаноўка справы, бязумоўна неправільная і яе трэба як мага хутчэй з моды вывесьці.

Адказныя працаўнікі, якія ў большасьці добра забясьпечаны матар'яльна (часта працуюць самі і іх жонкі) могуць наймаць работніцу, якая і дагледзіць дзяцей. Рабочая-ж сям'я, дзе і муж і жонка працуюць на заводзе, атрымліваючы ўдваіх 60—80 рублёў у месяц, ня могуць наймаць работніц, і іх дзяцей трэба прымаць у дашкольныя ўстановы.

Дашкольныя ўстановы не павінны зьвяртаць ніякай увагі на „запісачкі" розных «уплывовых» асоб і не павінны здавальняць іх. Кіраўніцтва дашкольнае ўстановы павінна мець заўсёды на ўвазе ступень сацыяльнага забясьпячэньня тэй ці іншай асобы і толькі на падставе гэтага адмаўляць ці здавальняць просьбы.

Справы аб няправільным прыёме дзяцей у дашкольныя ўстановы ўжо пачалі загружаць РСІ. Гэты факт гаворыць за тое, што справаю прыёму дзяцей у дашкольныя ўстановы пара зацікавіцца.

Бюро скаргаў НЕ РСІ вельмі правільна зрабіла, даручыўшы інспэктару дасьледаваць справу дашкольных устаноў і ўнесьці адпаведныя прапановы.

С. Азерскі.

Рознае.

НОВЫ АТРУТНЫ ГАЗ.

Нямецкія газэты паведамляюць, што ў Англіі знойдзен новы атрутны газ, які пранікае ва ўсе вядомыя да гэтага часу супрацьгазавыя маскі. Газ гэты ня мае паху і на сьмерць не атручвае, але выводзіць чалавека са строю на 6 гадзін.

РАДЫЁПРЫЁМНІКІ Ў АЎТАМАБІЛЯХ.

Такая навіна надаўна ўведзена ў Нью-Ёрку. Радыёпрыёмнік знаходзіцца побач з шофэрам, які і наводзе прыёмнік на тую станцыю, якую пажадае пасажыр. За слуханьне на радыё дадатковай платы ня бяруць.

ПРАЖЭКТАР НА САМАЛЕЦЕ ДЗЕЛЯ НАЧНЫХ ПАСАДАК.

На адным з аэрадромаў недалёка ад Парыжу адбыліся спробы з усталяваньнем на самалёце пражэктара, які кідае сьлюк на адлегласьць у 450 мэтраў. Пражэктар дае магчымасьць лётчыку спускацца на пасьвятленую пляшчу. Каб пазьбегнуць сутычку з другім самалётам, самалёт з пражэктарам мае сырэну.

Адказны рэдактар
М. КУДЗЕЛЬКА.

Беларуская станцыя Усесаюзнага Інстытуту прыкладной Батанікі і Новых Культур з глыбокім жалем апавяшчае аб раптоўнай прадчасной сьмерці на службовай пасадзе вучонага спэцыяліста станцыі прафэсара

Міколы Міхасёвага ГАЙДУКОВА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
ПЯТНІЦА, 30 лістапада
Для саюзу харчавікоў
„БРОНЕЦЯГНІК 14-69"
Рэвалюцыйная п'еса ў 6 абразах.
Пачатак роўна а 8-й гадзіне ўвечары.
Пасьля 3-га сыгналу ўваход у відоўню зачынен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 1) „ДОМ НА ТРУБНОЙ" у 6-ці частках. І заменная камэдыя 2) „КАХАНЬНЕ І СПОРТ" у 5-ці частках. Пачатак 1-га сэанс